ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ АД СПЁКІ І ТРАЎМАЎ

6

ЯК ЛЕГАЛІЗАВАЦЬ ЖЫЛЛЁВЫ «САМАБУД» –

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

16 жніўня 2023 г.
СЕРАДА
№ 157 (30037)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ЦЫТАТА ДНЯ

Наталля КАТОВІЧ, начальнік управўлення выхаваўчай і ідэалагічнай работы Нацыянальнага інстытута адукацыі:

«Перад установамі адукацыі ў новым навучальным годзе пастаўлена задача прыняць дзейсныя меры па забеспячэнні стапрацэнтнай занятасці вучняў у шосты школьны дзень, у канікулярны перыяд з прыцягненнем рэсурсаў устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, устаноў культуры, спорту, з выкарыстаннем патэнцыялу ваенна-патрыятычных клубаў, магчымасцяў дзіцячых і маладзёжных грамадскіх арганізацый».

СЯСТРЫНСКАЯ ПРАКТЫКА

Фота БелТА.

Будучы ўрач-педыятр Дар'я КІШЫК пасля трэцяга курса БДМУ першую сур'ёзную сястрынскую практыку прайшла ў Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы. Дзяўчына на добрым рахунку ва ўніверсітэце, у бальніцы таксама адзначылі яе як перспектыўнага работніка, запрашаюць папрацаваць у якасці медсястры. Дар'я Кішык упэўнена, што будучаму медыку неабходна медсястрынская практыка. Любы ўрач павінен ведаць працу спецыялістаў з сярэдняй медыцынскай адукацыяй, каб даць дакладнае заданне медперсаналу.

БелТА.

КАРАТКА

- **Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ аб павышэнні пенсій. Указам прадугледжваецца іх павышэнне з 1 верасня 2023 года ў сярэднім на 5 працэнтаў.**
- Рэальныя грашовыя даходы беларусаў у I паўгоддзі выраслі на 3,9 працэнта.
- **Міністр абароны КНР 16—18 жніўня наведае Беларусь.**
- У Беларусі намалацілі больш за 5,6 млн тон збожжа з улікам рапсу.
- **У Мінску праходзіць дабрачынная акцыя «Падзялюся ўраджаем»**
- Дапамогу на падрыхтоўку да школы ўжо атрымалі 75 працэнтаў шматдзетных сем'яў. Агульная сума выплат склала Br19 млн.
- **У Гомельскай вобласці 80 экіпажаў камбайнераў намалацілі па больш як 1 тыс. тон збожжа.**

ISSN 1990 — 763X

Пайсці, каб вярнуцца

Што трэба ведаць тым, хто збіраецца ў лес

Фота МНС.

У лясах краіны пайшлі грыбы — а значыць, на гарачую лінію МНС актыўна паступаюць званкі з просьбай аб пошуку чалавека. Нярэдка губляюцца кампаніямі. Пошукі могуць працягвацца не адзін дзень. Для некаторых ціхае паляванне заканчваецца зусім не хэпі-эндам.

Дарогу дадому з лясных сцяжын, як правіла, не знаходзяць тыя, хто не разлічвае свае сілы і заходзіць на вялікія адлегласці. Іншыя шукаюць грыбы ў незнаёмых месцах або там, дзе збіралі лясныя дары раней, не ўлічваючы той момант, што лес змяніўся.

СТАР. 3

У сезон

Паедзем на возера?

Як парадаваць сябе, калі гэтым летам вы так і не выбраліся да мора

У Турцыі — землятрус, у Егіпце — акулы, у Грузіі — апоўзень, у Еўропу не асабліва і даедзеш, далёкія курорты — не ўсім па кішэні. Што рабіць, калі прыйшоў доўгачаканы водпуск, а вы гэтым летам так нікуды і не выехалі? Адказ — адпачываць у роднай Сінявокай і паспрабаваць атрымаць максімум ад гэтага лета: яно ўжо на фінішы і ніколі не паўторыцца, так што давайце правядзём свой цалкам заслужаны за працоўны год водпуск з задавальненнем. Бо шчасце, як сцвярджалі старажытныя ідэалісты-філосафы, знаходзіцца ўнутры і не павінна залежаць ад зменлівага навакольнага свету...

СТАР. 4

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«МЫ АБСАЛЮТНА АДКРЫТЫЯ ДА ПРАДМЕТНАЙ РАЗМОВЫ ПА ЎСІХ НАПРАМКАХ СУПРАЦОЎНІЦТВА»

Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу з губернатарам Томскай вобласці Уладзімірам Мазурам

Сібіры ў беларуска-расійскім супрацоўніцтве на рэгіянальным узроўні адводзіцца вялікае значэнне. Гэты вялікі, найбагацейшы край па праве называюць скарбніцай не толькі Расіі, але і свету. Значны рэсурсны, прамысловы, турыстычны, а таксама інтэлектуальны патэнцыял рэгіёна ўяўляе каласальную цікавасць і для нас. Невыпадкова Томская вобласць з'яўляецца для Беларусі адным з перспектыўных сібірскіх партнёраў. Сведчанне гэтаму — імклівы рост тавараабароту. За першае паўгоддзе аб'ём узаемнага гандлю павялічыўся тройчы ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Аднак гэта не нагода запавольваць тэмп. Наадварот, самы час абмеркаваць новыя кірункі дзейнасці ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

«ВАЖНА, ШТО МЫ СЫХОДЗІМ АД ЗНЕШНЯЙ ЗАЛЕЖНАСЦІ»

Як адзначыў Прэзідэнт, у мінулым годзе аб'ём гандлю паміж Беларуссю і Томскай вобласцю вырас амаль на 50 % і склаў без малога 23 мільёны долараў. «Станоўчая дынаміка назіраецца і сёлета, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — За першае паўгоддзе рост — амаль 30 %. Але абсалютна відавочна, што гэта вельмі мала для такіх магутных у прамысловых, сельскагаспадарчых адносінах краёў. Тавараабарот можа і павінен быць як мінімум у два-тры разы большы».

Пунктаў росту для сумеснага развіцця, па меркаванні беларускага лідара, звышдастаткова. «Адной з традыцыйных асноў нашага эканамічнага супрацоўніцтва з'яўляецца экспарт у ваш рэгіён сельскагаспадарчай сыравіны, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — І не толькі соладу».

У 2022 годзе ў Томскую вобласць пачаліся пастаўкі амінакіслот Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыяй. «Гэты прадукт, вы ведаеце, выццёва неабходны ў жывёлагадоўлі, — удакладніў кіраўнік дзяржавы. — І з улікам рознага кшталту ціску на нас і санкцый Захаду вельмі важна, што і тут мы сыходзім ад знешняй залежнасці».

Прэзідэнту дакладваюць, што для Томска і вобласці ў цэлым актуальным з'яўляецца пытанне мадэрнізацыі гарадскога электрычнага транспарту. «Ведаю, што ў вас шырока эксплуатуюцца беларускія тралейбусы, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Мы гатовы забяспечыць усёй лінейкай патрэбнай тэхнікі, у тым ліку трамваямі, аўтобусамі і электробусамі».

Беларускі бок (прадпрыемства «Магілёўліфтмаш») можа цалкам задаволіць патрэбу рэгіёна і ў ліфтавым абсталяванні — як для новабудоўляў, так і ў рамках праграм замены ліфтаў.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што за апошнія гады Томская вобласць дабілася важкіх поспехаў у аграрным сектары. «Мы ўносім свой сціплы ўклад у гэты працэс, — удакладніў ён, маючы на ўвазе беларускую сельскагаспадарчую тэхніку, перш за ўсё трактары і камбайны. — Мяркуем, што наш вопыт і якасныя тэхналогіі таксама маглі б быць запатрабаваныя вамі ў жывёлагадоўлі, раслінаводстве, а таксама будаўніцтве малочнатаварных фермаў і зернесушыльных комплексаў. Мы гатовы падзяліцца тэхналогіямі апрацоўкі і перапрацоўкі лёну-даўгунцу. Ваш край, як і ўся Беларусь, з'яўляецца ў гэтым плане флагманам».

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што больш за 60 % тэрыторыі Томскай вобласці занята лясамі. Таксама ў рэгіёне — каласальныя запасы торфу. Гэта багацце, як перакананы беларускі лідар, трэба не толькі эфектыўна выкарыстоўваць, але і сумець зберагчы: асабліва ад пажараў, якія пачасціліся ў апошнія гады. У гэтай сувязі Беларусь гатова падзяліцца напрацоўкамі ў вытворчасці лесанарыхтоўчай, пажарнай, аварыйна-ратавальнай тэхнікі, машын для здабычы торфу.

«МЫ ПАВІННЫ РАЗУМНА І РАЦЫЯНАЛЬНА ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ВЫСОКІЯ КАМПЕТЭНЦЫІ АДЗІН АДНАГО»

Аляксандр Лукашэнка лічыць правільным, што асаблівая роля ў сацыяльна-эканамічным развіцці расійскага рэгіёна адводзіцца навукова-адукацыйнай сферы. «Сёння Томская вобласць уваходзіць у тройку лідараў нацыянальнага навукова-тэхналагічнага рэйтынгу Расіі, а горад Томск называюць студэнцкай сталіцай, — канкрэтызаваў Прэзідэнт. — Безумоўна, якаснае навучанне моладзі і падрыхтоўка навуковых кадраў — гэта залог паспяховай будучыні любой краіны».

Кіраўнік дзяржавы паведаміў, што паміж установамі адукацыі Беларусі і Томскай вобласці дзейнічаюць 25 дагавораў аб супрацоўніцтве, выконваецца шэраг сумесных навукова-даследчых праектаў. Аднак, па меркаванні беларускага лідара, патэнцыял узаемадзеяння ў адукацыі і навуцы паміж нашай краінай і гэтым расійскім рэгіёнам далёка не раскрыты. «Мы павінны разумна і рацыянальна выкарыстоўваць высокія кампетэнцыі адзін аднаго», — пераканаў Аляксандр Лукашэнка.

Добрым прыкладам такой інтэлектуальнай каапэрацыі, на думку кіраўніка дзяржавы, можа стаць рэалізацыя расійскімі вучонымі сумесна з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і кампаніямі праекта па вытворчасці транзістараў для аэракасмічнага і спецыяльнага прызначэння, што цяпер вельмі актуальна. Прэзідэнт упэўнены, што разам нам пад сілу стварыць самыя перадавыя тэхналогіі, ліквідуючы залежнасць Расіі і Беларусі ад Захаду.

«Мы абсалютна адкрытыя да прадметнай размовы па ўсіх напрамках супрацоўніцтва, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Вы можаце быць абсалютна ўпэўнены: калі мы паабяцаем нешта і дамовімся аб чымсьці, беларусы абавязкова гэта выканаюць. Я запэўніваю вас, што нашы дамоўленасці будуць выкананы на сто і нават больш, чым на сто, працэнтаў».

Напрыканцы сустрэчы кіраўнік дзяржавы выказаў удзячнасць губернатару Томскай вобласці і яго калегам, што яны знайшлі час і прыехалі ў Беларусь, каб паглядзець, як яна развіваецца, пераняць вопыт і перадаць свой каштоўны досвед дзеля развіцця нашай агульнай Айчыны — ад Брэста да Уладзівастока.

Вераніка КАНЮТА.

У тэму

«Павелічэнне тавараабароту — задача амбіцыйная, але вырашальная»

У размове з журналістамі **губернатар Томскай вобласці Уладзімір МАЗУР** адзначыў, што сёння шмат кірункаў, якія звязваюць беларускі і расійскі народы як эканамічна, так і культурна. «Калі мы возьмем аграрны сектар, то тут, пачынаючы ад тэхнікі, яе набыцця, паставак камплектуючых да тэхнікі з Беларусі ў частцы радыёэлектронікі і заканчваючы селекцыяй, — гэта новыя віды сартоў гародніны і збожжавых, — канкрэтызаваў асноўныя напрамкі ўзаемадзеяння Беларусі з Томскай вобласцю яе кіраўнік. — Калі кажам аб навуцы, то прапанова Акадэміі навук Беларусі ад нашага навукова-адукацыйнага комплексу, дзе мы маем агульныя кампетэнцыі і напрацоўкі, — абмен меркаваннямі, тымі прапановамі, якія мы сфармулявалі для сучаснага развіцця эканомікі». У сваю чаргу, як падкрэсліў губернатар, томскім вучоным таксама ёсць што запазычыць у беларускіх калег.

Кажучы аб супрацоўніцтве ў культурнай сферы, Уладзімір Мазур падкрэсліў, што ў нас агульная гісторыя. «Нашы народы заўсёды неслі гэту традыцыйную культуру і захоўвалі», — звярнуў увагу ён, удакладніўшы, што канкрэтныя прапановы дэлегацыя ўжо вязе дамоў.

«Беларусь захавала за гэтыя гады навуку, а менавіта развіццё і высокатэхналагічныя падыходы да тых ці іншых прамысловых кірункаў, як і Расія, — звярнуў увагу Уладзімір Мазур. — Дзесьці кампетэнцый больш у Беларусі, дзесьці — у Расіі. Сёння казаць ужо лепш не аб імпартазамяшчэнні, а аб імпартаапярэджанні або незалежнасці ад імпарту. Мы маем усё для таго, каб ісці наперад і быць канкурэнтнымі з сусветнымі стандартамі, у сферы высокіх тэхналогій».

Павелічэнне тавараабароту паміж Томскай вобласцю і нашай краінай — задача, па словах кіраўніка рэгіёна, амбіцыйная, але вырашальная. «У сілу праведзеных сустрэч у Гродзенскай вобласці, цяпер у Мінску мы бачым, што гэтая задача выканальная», — падкрэсліў ён.

14 жніўня ў рамках паездкі на Гродзеншчыну Уладзіміра Мазура прыняў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік. Праведзена 4-е пасяджэнне працоўнай групы па супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Томскай вобласцю Расійскай Федэрацыі. Расійская дэлегацыя наведала агратурыстычны комплекс «Гарадзенскі маёнтак «Каробчыцы», Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, прадпрыемствы «Спецаўтагаспадарка» і «Гроднаводаканал».

Пасля сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі адбыліся перагаворы губернатара Томскай вобласці з намеснікам прэм'ер-міністра Пятром Пархомчыкам. Завяршыўся візіт расійскай дэлегацыі ў Беларусь наведваннем Інстытута фізікі імя Б. І. Сцяпанава НАН Беларусі і ААТ «Планар».

Міжнародны вектар

ДЫЯЛОГ ДЗЕЛЯ ЗАХАВАННЯ МІРУ

Наша слова на XI Маскоўскай канферэнцыі па міжнароднай бяспецы

З моманту свайго заснавання ў 2012 годзе форум стаў запатрабаванай пляцоўкай адкрытага абмеркавання найбольш актуальных праблем глабальнай і рэгіянальнай бяспекі. Сёлета канферэнцыя праводзілася ва ўмовах кардынальнай змены ваенна-палітычнага становішча ў свеце, станаўлення і ўмацавання рэальнага шматпалярнага светаўладкавання. Кіраўнікі і прадстаўнікі абаронных ведамстваў, міжнародных арганізацый, экспертнай і паліталагічнай супольнасцяў абмяняліся думкамі па ўмацаванні канструктыўнага ўзаемадзеяння ў новых рэаліях.

«Беларусь прыкладае максімум намаганняў у барацьбе з выклікамі і пагрозамі»

Прывітанне ўдзельнікам канферэнцыі накіраваў Прэзідэнт Беларусі. «За мінулае дзесяцігоддзе такія сустрэчы і зносіны ў фармаце шматбаковага дыялогу па прыярытэтных напрамках забеспячэння глабальнай і рэгіянальнай бяспекі сталі вельмі запатрабаваны і актуальны, — перакананы Аляксандр Лукашэнка. — Яны даюць магчымасць абмяняцца прафесійнымі меркаваннямі, комплексна ацаніць дынаміку ва ўсіх рэгіёнах зямнога шара, зверыць парадак дня па ключавых праблемах захавання міру».

Беларускі лідар звярнуў увагу на тое, што бягучая міжнародная абстаноўка застаецца беспрэцэдэнтна напружанай. «Абвастрыліся практычна ўсе вядомыя выклікі і пагрозы, — адзначыў ён. — Дыскрэдытавана міжнародныя права ў сферы кантролю над узбраеннямі. Нарастаюць рызыкі прымянення зброі масавага знішчэння, уключаючы правакацыі з выкарыстаннем ядзерных і біялагічных сродкаў паражэння».

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што інфармацыйныя войны, кіберзлачынствы сталі магутным фактарам эканамічнай і нацыянальнай нестабільнасці для ўсіх без выключэння дзяржаў. Сёння, па яго словах, новым відам зброі, якая падрывае сістэму міжнародных гандлёва-эканамічных сувязяў, выступаюць розныя абмежавальныя меры і санкцыі, якія з інструмента прымусу да міру і бяспекі ператварыліся ў комплексную пагрозу глабальнага маштабу.

«На гэтым фоне, застаючыся паслядоўным прыхільнікам забеспячэння міру і бяспекі, выконваючы раней узятыя на сябе міжнародныя абавязацельствы, Рэспубліка Беларусь разам з партнёрамі, а таксама ў рамках Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі прыкладае максімум намаганняў для ўмацавання ўзаемадзеяння ў барацьбе з транснацыянальнымі выклікамі і пагрозамі рознага характару, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Размяшчаючы тактычную ядзерную зброю на беларускай тэрыторыі, мы адэкватна рэагуем на паскораную мілітарызацыю Усходняй Еўропы і рост ваеннай актыўнасці ЗША і НАТА. Разам з тым гэта не адмяняе мірныя ініцыятывы, якія вылучаюцца беларускім бокам у інтарэсах перазапуску дыялогу па пытаннях еўрапейскай і глабальнай бяспекі на роўных умовах на карысць усёй планеты — нашага агульнага дома».

Звяртаючыся да ўдзельнікаў канферэнцыі, Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што чарговая сустрэча ў Маскве паслужыць ценаснаму ўмацаванню супрацоўніцтва паміж дзяржавамі і народамі, стане значным этапам на шляху пабудовы новай сістэмы міжнароднай бяспекі.

«Асобныя заходнія палітыкі працягваюць штурхаць свет у прорву»

Падчас выступлення на XI Маскоўскай канферэнцыі па міжнароднай бяспецы міністр абароны Беларусі Віктар Хрэнін заўважыў, што многія краіны ўключыліся ў барацьбу з Захадам, адстойваючы сваю незалежнасць і суверэнітэт. «Сёння гэтая барацьба вылілася ў глабальнае супрацьстаянне паміж Захадам і Усходам на тэрыторыі Украіны, — удакладніў ён. — Пры гэтым проксі-вайна, якая разгарнулася там, фактычна паставіла планету на мяжу трэцяй сусветнай вайны».

Кіраўнік беларускага ваеннага ведамства перакананы, што асобныя заходнія палітыкі сваімі дзеяннямі працягваюць штурхаць свет у прорву. «Яны па-ранейшаму думаюць катэгорыямі «метраполій» і «калоній», фактычна адраджаючы гандаль рабамі ў новай форме, — заявіў ён. — Для гэтых сучасных неаколанізатараў уласныя грамадзяне становяцца жывым таварам. Мы назіраем, як большасць падкантрольных Вашынгтону кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў паводзяць сябе падобна сярэднявечным гандлярам рабамі, прапаноўваючы за грошы кінуць народы сваіх краін у мясарубку вайны».

У тым, што еўрапейскія ўладныя эліты арыентаваны менавіта на глабальную вайну з Усходам, па словах Віктара Хрэніна, сумнявацца не даводзіцца. «Паказальная ў гэтым плане рыторыка ўдзельнікаў ліпеньскага саміту НАТА ў Вільні, — канкрэтызаваў міністр абароны. — Нягледзячы на тое што шматлікія эксперты завуць яго мыльнай бурбалкай у плане чаканых лёсавызначальных рашэнняў, утоены падтэкст заяў, якія на ім гучалі, відавочна знакавы. Вынікі саміту прыадкрываюць планы альянсу на развіццё сітуацыі ў свеце ў найбліжэйшай перспектыве».

Паводле прэс-службаў Прэзідэнта і Мінабароны.

Пайсці, каб вярнуцца

ГРЫБНІКОЎ ШУКАЮЦЬ ШТОДЗЕНЬ

Грыбнікі губляюцца ў беларускіх лясах кожны дзень. Увечары 7 жніўня ратавальнікам паступіла паведамленне аб тым, што ў лясным масіве паблізу вёскі Ліпск Докшыцкага раёна згубілася сям'я. Як потым высветлілася, сужэнцы і іх чатырохгадовы сын, якія жывуць у сталіцы, пайшлі ў лес у грыбы. Тое, што заблудзіліся, яны зразумелі, калі вярталіся назад. Тады мужчына патэлефанаваў у службу ратавання. Сувязь са згубленымі падтрымлівалася па мабільным тэлефоне. Літаральна праз гадзіну сям'я выйшла з лесу на сігнальна-гукавую прыладу аўтацыстэрны.

У той жа дзень, але ўжо бліжэй да ночы, лепельскім ратавальнікам паступіла паведамленне ад пажылога грыбніка, якога ў лесе напаткала непагадзь. Дрэвы пападалі на лясныя дарогі, і пенсіянер не змог выбрацца з гушчару. У пошукавых мерапрыемствах былі задзейнічаны тры адзінкі тэхнікі і дзесяць чалавек. Праз некаторы час мужчына самастойна вярнуўся дадому. У медыцынскай дапамозе ён патрэбы не меў.

Днямі двое пенсіянераў заблукалі ў Магілёўскай вобласці. Адзін не змог самастойна выбрацца з лесу ў Горацкім раёне. У грыбы мужчына адправіўся з таварышам. Скончыўшы ціхае паляванне, яны вярнуліся да машыны. Аднак пенсіянер вырашыў вярнуцца ў лес і праверыць яшчэ адзін узлесак. Праз чатыры гадзіны ён зразумеў, што згубіўся, і патэлефанаваў ратавальнікам.

У пошуках удзельнічалі шэсць адзінак тэхнікі і 20 работнікаў МНС, дапамагалі супрацоўнікі органаў унутраных спраў і ляснік. Як расказаў **начальнік Горацкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Сяргей КАЗЛОЎ**, пашанцавала, што пенсіянер быў на сувязі. «У нейкі момант ён убачыў квартальны слуп і паведаміў нам лічбы, якія на ім размешчаны, — так мы яго і знайшлі», — удакладніў ратавальнік.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Тым жа вечарам пошукавыя работы разгарнуліся ў лясным масіве ў Асіповіцкім раёне, дзе згубілася жанчына 1940 года нараджэння. Трывогу забілі сваякі: пенсіянерка пайшла ў лес у ягады раніцай у лёгкім адзенні, а днём пачалася навальніца. Да бабулі спрабавалі датэлефанавацца: тэлефон, які знаходзіўся пры ёй, быў недаступны.

«Прачэсвалі лясны масіў, дзе жанчына магла знаходзіцца, пешшу і на квадрацыкле, — расказаў **намеснік начальніка Асіповіцкага раённага ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Мікалай ЯРМОЛЕНКА**. — Праз 2,5 гадзіны пошукаў нам пашанцавала: у бабулі пачала лавіць мабільная сувязь, і мы да яе датэлефанаваліся. Ужо праз гадзіну знайшлі пацярпелую па костачку ў балоце і з прыкметамі пераахаладжэння». Жанчыну шпіталізавалі ва ўстанову аховы здароўя для абследавання.

Дзве жанчыны з дзецьмі звярнуліся да ратавальнікаў, калі зразумелі, што не могуць адшукаць дарогі дахаты ў Віцебскім раёне. Кампанія збірала грыбы. Да месца паведамлення адразу ж выехала найбліжэйшае падраздзяленне МНС. У дарозе ратавальнікі звязаліся з пацярпелымі па тэлефоне.

«Адна з жанчын паведаміла, у якім месцы яны прыкладна заходзілі ў лес, — згадаў абставіны пошукавага мерапрыемства **ратавальнік Віталь ВЫСОЦКІ**. — Мы даехалі да поля, там стаялі людзі, якія паказалі, у які бок ехаць. Дабраліся да балоцістай мясцовасці, далей праехаць было немагчыма. Мой таварыш Уладзімір Бойка пачаў падаваць сігнал гучнагаварыцельнай прылады цыстэрны, а я ў гэты час тэлефанаваў тым, хто згубіўся. Яны сказалі, што чуюць сігнал аддалена. Каб вызначыць максімальна блізкую да іх адлегласць, мы пераязджалі ў розныя пункты, падавалі сігнал цыстэрны і стэлефаноўваліся з імі. Вызначыўшы месца, дзе яны чулі нас лепш за ўсё, я, надзеўшы гарнітур і застрахаваўшыся вяроўкай, якую трымаў мой таварыш, адправіўся ў лес і ўвесь час клікаў іх, а яны адказвалі. Праз некаторы час убачыў пацярпелых, якія разгублена стаялі і баяліся ісці, таму што вакол было балота».

ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ВЫ ЗАБЛУКАЛІ Ў ЛЕСЕ:

— не панікуйце;

— прыслухайцеся. Гукі могуць дапамагчы вам высветліць, што знаходзіцца побач, ідзіце на іх. Шум трактара звычайна чуваць за 3-4 кіламетры, брэх сабакі — за 2-3 кіламетры, цягнік — за 10 кіламетраў;

— шукайце лініі электрапередачы, прасекі і сцяжынкі — прытрымлівайцеся іх і абавязкова выйдзеце да населеных пунктаў;

— калі на шляху сустрэўся ручай ці рака, ідзіце ўніз па цячэнні — яны заўсёды прывядуць да людзей;

— патэлефануйце ў МНС (па нумары 101 або 112) і паведаміце, з якога населенага пункта і якога раёна вы ўвайшлі ў лес, апішыце, што бачыце па баках. Калі апынуліся ў лесе без тэлефона, супакойцеся і настройцеся на добры выхад;

— калі пачынае цямнець, сарыентуйцеся на мясцовасці і падумайце, дзе арганізаваць начлег. Для начлегу можна выкарыстаць яму ад вывернутага з коранем дрэва. Зрабіце з галін сховішча накшталт шалаша і посцілку з падручных матэрыялаў. Ліст газеты, засунуты пад адзенне, у два разы зменшыць цеплааддачу. Такі ж эфект дае і лістота, набітая пад адзенне. Паспрабуйце знайсці ваду. Арганізуючы начлег, паклапаціцеся аб тым, каб тыя, хто будзе вас шукаць, не прайшлі міма: дзеля прыцягнення ўвагі павесьце на кусты кепку, хустку або ліст паперы, абламайце галінкі.

Па чарзе супрацоўнік МНС дапамог жанчынам і дзецям выйсці на небалоцістую мясцовасць. Усе разам яны пакінулі лес. Пацярпелыя знаходзіліся ў нармальным стане, іх здароўю нічога не пагражала.

Аб тым, што патрэбна дапамога ў пошуку мужчыны, які згубіўся ў лясным масіве Барысаўскага раёна, днямі ў раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях паведаміла яго жонка. Раніцай мужчына разам са сваім сабакам пайшоў у грыбы. У абед яму паспрабавала патэлефанаваць жонка, але сужэнец на сувязь не выйшаў — мабільны тэлефон адключыўся. Зрабіўшы некалькі спроб звязацца з мужам, жанчына патэлефанавала ў МНС. Ратавальнікі, якія аператыўна прыбылі на прыблізнае месца пошуку, працавалі на водгук, але на сваё імя чалавек, якога яны шукалі, не адгукаўся. Мужчыну знайшлі ў глыбіні лесу. У пошукава-ратавальнай аперацыі ўдзельнічалі дзевяць чалавек. Вечарам пацярпелы быў знойдзены, у медыцынскай дапамозе патрэбы ён не меў.

ІДЗЯЦЕ Ў ЛЕС — ПАПЯРЭДЗЬЦЕ РОДНЫХ

Перш чым ісці ў лес, ратавальнікі рэкамендуюць падрыхтавацца. Па-першае, важна прадумаць, у чым вы пойдзеце. Незалежна ад надвор'я (на працягу некалькіх гадзін яно можа кардынальна памяняцца) надзеньце вопратку, якая не прамакае. Абавязкова паклапаціцеся аб тым, каб у вашым адзенні быў яркі элемент (напрыклад, чырвоная куртка або аранжавая кепка, сіняя хустка) — калі вы раптам згубіцеся, ратавальнікам будзе прасцей вас заўважыць. Па-другое, нават калі вы разлічваеце, што ідзяце ў лес ненадоўга, у любым выпадку вазьміце з сабой вады, штосьці з ежы. Добра, калі ў кішэню пакладзяце компас і — абавязкова! — зараджаны мабільны тэлефон. Людзям, якія маюць пэўныя праблемы са здароўем, ціхага палявання ўвогуле варта пазбягаць. Калі ўсё ж такі адважыліся пайсці ў лес, вазьміце з сабой лекі, якія пастаянна прымаеце.

Варта ўстрымацца ад лясных падарожжаў пажылым людзям. Менавіта гэтая катэгорыя грамадзян, адпраўляючыся ў грыбы ці ягады, часцей за ўсіх самастойна не вяртаецца дадому. Калі ж вы ўпэўнены ў сваіх сілах, не ідзіце на далёкія адлегласці і выбірайце знаёмыя шляхі. Дзецям у лесе можна знаходзіцца толькі ў прысутнасці дарослых. Ніякіх гульняў у лясным масіве быць не павінна!

— Абавязкова папярэдзьце родных, што ідзяце ў лес, а таксама раскажыце ім, у якім месцы збіраецеся заходзіць, па якім маршруце плануеце ісці і калі мяркуеце вярнуцца, — звяртае ўвагу **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ**. — Пры адсутнасці сваякоў паведаміце аб сваіх планах знаёмым або суседзям. Калі вы дрэнна арыентуецеся на мясцовасці, лепш у лес увогуле не хадзіць. Вырашылі пайсці — запрасіце з сабой таго, хто добра ведае лясны масіў.

Заблукаць у лесе можа кожны. Прычым нават там, дзе ўсе сцяжынкі вядомыя. А колькі было выпадкаў, калі людзі губляліся ў мясцінах, дзе ўсё жыццё хадзілі. Таму вельмі карысная парада для тых, хто любіць лясныя падарожжы: варта запамінаць, з якога боку зайшлі ў лес і дзе ў гэты момант знаходзіцца сонца. Гэта абавязкова спатрэбіцца, калі будзеце вяртацца назад.

Не панікуйце, калі ў лесе вас заспела навальніца. У такім выпадку трымайцеся далей ад высокіх дрэў, якія стаяць асобна. Не размяшчайцеся каля вогнішча: слуп гарачага паветра з'яўляецца добрым правадніком электрычнасці. Часцей за ўсё маланка ўдарае ў дубы, таполі і вязы, радзей — у бярозу і клён. Схавацца лепш паміж нізкарослымі дрэвамі з густымі кронамі. Выбіраючы сабе прытулак, звярніце ўвагу, каб побач не было расшчэпленых дрэў, у якія раней трапіла навальніца. Справа ў тым, што зямля на такім участку мае высокую электраправоднасць, ёсць верагоднасць таго, што ўдар маланкі можа сюды трапіць яшчэ раз.

Вераніка КАНЮТА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Махачкале прагрымеў узрыў на АЗС, загінулі як мінімум 35 чалавек

Выбух адбыўся ў панядзелак увечары на аўтазаправачнай станцыі на выездзе з Махачкалы, пачаўся моцны пажар, паведамляе ТАСС. Па звестках на сярэдзіну дня аўторка, плошча ўзгарання дасягала 600 кв. м. Пажарнікам удалося лакалізаваць, а пасля і ліквідаваць узгаранне ноччу. Па ўдакладненых звестках інфармацыйнага агенцтва, у выніку надзвычайнага здарэння загінулі 35 чалавек, у тым ліку трое дзяцей. 80 чалавек пацярпелі, 65 праходзяць стацыянарнае лячэнне, уключаючы 16 дзяцей.

Кіраўнік Дагестана Сяргей Мелікаў паведаміў журналістам, што месца першапачатковага выбуху было насупраць АЗС — у будынку станцыі тэхабслугоўвання аўтамабіляў. «Прычыны і характар выбуху ўстанаўліваюцца. З гэтага пункта выбуху здэтанавалі ёмістасці запраўкі, што знаходзіцца насупраць, у выніку чаго адбыліся ўзгаранне і пажар», — сказаў Сяргей Мелікаў. З васьмі цыстэрнаў з палівам на АЗС узарваліся дзве. «Дзякуючы гераічным дзеянням супрацоўнікаў экстранных службаў былі выратаваны жыцці многіх людзей, удалося пазбегнуць узгарання і дэтанацыі ацалелых ад першага выбуху рэзервуараў з палівам, што прывяло б да яшчэ больш цяжкіх наступстваў», — дадаў Мелікаў.

Следчыя органамі СК РФ узбуджана крымінальная справа па прыкметах злачынства, прадугледжанага ч. 3 арт. 238 КК РФ (аказанне паслуг, якія не адпавядаюць патрабаванням бяспекі жыцця або здароўя спажыўцоў, якія пацягнулі па неасцярожнасці смерць дзвюх або больш асоб). «На версіі следства, 14 жніўня 2023 года прыкладна ў 21.50 у будынку станцыі тэхнічнага абслугоўвання аўтамабіляў, размешчаным на скрыжаванні вуліцы Кулінская вёскі Навакалі і Федэральнай шашы, падчас работ па тэхнічным абслугоўванні аўтамабіляў адбылося ўзгаранне і наступны ўдар, у выніку якога пацярпелі людзі. Акрамя таго, пашкоджаны размешчаныя побач будынкі і аўтамабілі. У цяперашні час праводзяцца следчыя дзеянні, накіраваныя на ўстанаўленне ўсіх абставін здарэння і вінаватай асобы, прызначаны судова-медыцынскія і іншыя неабходныя экспертызы», — гаворыцца ў паведамленні ведамства.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне Прэзідэнту Расійскай Федэрацыі Уладзіміру Пуціну ў сувязі са шматлікімі чалавечымі ахвярамі ў выніку выбуху на аўтазаправачнай станцыі ў Махачкале. «Ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказваю шчырыя спачуванні родным і блізкім загінулых, жадаю найхутчэйшага выздараўлення ўсім пацярпелым», — гаворыцца ў спачуванні. 15 жніўня аб'яўлены днём жалобы ў Дагестане.

WSJ: у ЗША зафіксаваны рэкордны рост колькасці бяздомных у 2023 годзе

Колькасць бяздомных у ЗША за апошні год выраслa на рэкордныя 11 % і на сёння перавышае 577 тысяч чалавек. Гэты паказчык стаў самым высокім за ўсю гісторыю назіранняў, паведамляе выданне The Wall Street Journal (WSJ) са спасылкай на ўласнае даследаванне. Да асноўных прычын павелічэння колькасці бяздомных эксперты адносяць высокі кошт жылля, недахоп арэндных памяшканняў, а таксама рост колькасці мігрантаў.

Яшчэ адным фактарам стала скарачэнне шэрагу ўрадавых мер па падтрымцы насельніцтва ў перыяд пандэміі COVID-19. «Сродкі, выдзеленыя на ліквідацыю наступстваў каранавіруса, служылі буферам. Цяпер мы назіраем, што адбываецца, калі гэтыя рэсурсы больш не даступныя», — адзначылі ў амерыканскай кааліцыі па падтрымцы бяздомных.

У канцы 2022 года адміністрацыя ЗША прадставіла план па скарачэнні колькасці бяздомных у краіне на 25 % да 2025 года. Згодна з новай стратэгіяй, Вашынгтон павінен пачаць работу з уладамі штатаў і гарадоў, якім будзе аказвацца федэральная падтрымка для вырашэння гэтай праблемы.

ПАЕДЗЕМ НА ВОЗЕРА?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Капрызы надвор'я і ў нас, вядома, не цешаць, ламаюць планы адпачывальнікаў і нават прыводзяць да сумных наступстваў. Калі вы бачылі, як разбіраюць бураломы на Заслаўскім вадасховішчы (яно ж Мінскае мора), то, напэўна, пагодзіцеся з гэтай думкай. Але і ў нас бываюць пагодлівыя летнія дзянькі, калі хочацца купацца, загараць і есці шкодны, але такі смачны шашлык. А прагнозы надвор'я нам аб такіх днях паведамляюць загадзя (няхай і не заўсёды дакладна). Так што ўспамінаем тэзіс аб шчасці ўнутры, прымаем яго на веру і адпраўляемся на адзін з вадаёмаў краіны — добра, што ўжо чаго-чаго, а гэтага багацця ў нас хапае, на любы густ і кашалёк. Можна выбраць варыянт даражэйшы — на платных пляжах (напрыклад, шыкоўны — у ГСК «Лагойск»), у аграсядзібах і пансіянатах (ажыятаж ужо схлынуў, і месцы, у прынцыпе, ёсць, калі пашукаць). Можна танней — на пляжах грамадскіх, яны таксама добраўпарадкаваныя, з добрым дном і пастамі ратавальнікаў (што асабліва важна, калі вы з дзецьмі), а пераначаваць — у самай звычайнай савецкага ўзору гасцініцы ў мястэчку паблізу, выдзе нядорага. А можна пазагараць і ўдосталь накупацца наогул практычна бясплатна: калі далёка ад хаты не ад'язджаць, а перакус узяць з сабой. Вы выдаткуеце толькі на бензін і каўбасу/сала/хлеб/гародніну-садавіну (якія з'ясце пасля купання — паверце, на свежым паветры есці захочацца абавязкова!) і пітную ваду. А мы падрыхтавалі для вас топ азёр, куды можна адправіцца, каб яшчэ паспець пацешыцца летам — як з палаткамі, так і без іх.

ГАЮЧАЯ СІЛА ВАДЫ

І першым у нашым спісе будзе, зразумела, Нарач — візітка краіны і самае знакамітае беларускае возера. Тут ёсць уся інфраструктура: і месцы для лоўлі рыбы, і абсталяваныя пляжы, і крамы, і магчымасць спыніцца з палаткай. Можна выправіцца туды як вялікай кампаніяй, так і проста з дзецьмі. Рознага кшталту плаўсродкі — ад лодак да водных матацыклаў — існуе магчымасць узяць напракат (да іх прыкладаюцца выратавальныя камізэлькі). Дарэчы, ёсць там і такая опцыя, як аўтакемпінг, — для нашых шырот эксклюзіўная. Калі ў вас ёсць хатка на колах, якую можна вазіць з сабой (што наўрад ці, бо ў нас такое не асабліва прынята), або калі вы гатовыя ўзяць яе напракат (што больш верагодна), то вам там спадабаецца. Аўтакемпінг знаходзіцца ў прыгожым сасновым лесе, ад вады — усяго 300 метраў, ёсць альтанкі і абсталяваныя месцы для смецця.

Рэпутацыю Нарачы моцна падмачылі вадаплавальныя птушкі, якія аблюбавалі возера даўнымдаўно: менавіта яны вінаватыя ў праблеме цэркарыёзу. Калі вада награваецца да 22 градусаў, лічынкі фекалій качыных птушак мігрыруюць у малюскаў, але па шляху могуць сустрэцца з купальшчыкам. Медыкі адзначаюць, што небяспекі асабліва тут няма — могуць з'явіцца пачырваненні, што свярбяць, на скуры некаторых асабліва ўспрымальных людзей (але болькі хутка пройдуць). Каб гэтага не здарылася, пасля купання рэкамендуецца абмыцца пад душам: пляжы імі абсталяваныя.

Праблема гэтая даўняя, і яна паспяхова вырашаецца. Малюскаў вылоўліваюць, а каля берагоў пабудавалі доўгія пантоны, адкуль і рэкамендуецца спускацца ў ваду (цэркарыёз падхапіць можна на мелкаводдзі, з павелічэннем глыбіні гэта небяспека знікае). Як вынік, згодна з медыцынскай статыстыкай, калі ў 2007 годзе з алергадэрмітам пасля купання ў Нарачы да ўрачоў звярнуліся 600 чалавек, то ўжо ў 2019-м быў толькі адзін зварот. Магчыма, выпадкаў больш, але людзі паспяхова спраўляюцца самі: проста купляюць у аптэцы мазь, і праз 2 дні ўсё праходзіць. Так што рэпутацыя рэпутацыяй, а купанне ў Нарачы афіцыйна дазволена. А яшчэ там па-ранейшаму можна купіць фірмовага нарачанскага вэнджанага вугра (гэта брэнд вадаёма ўжо не адзін дзясятак гадоў). Цана на ласунак, вядома, высачэзная, але калі вугор невялікі, то чаму б і не раскашэліцца? Магчыма, аб гэтым выдаткаванні вы будзеце шкадаваць, але што праўда тое праўда: вельмі смачна.

На Палессі можна адпраўляцца практычна на любы вадаём: там вельмі шмат прыгожых месцаў і — бонус — тэмпература паветра і вады прадказальна на пару градусаў вышэйшая, чым на Міншчыне і Віцебшчыне.

Свіцязь — яшчэ адзін сімвал нашай краіны, куды варта даехаць. Празрыстая вада — рэдкасць для нашых шырот — выклікае жаданне нырнуць, з маскай ці проста з расплюшчанымі вачыма. Ёсць спецыяльна абсталяванае месца пад палатачны лагер: права размясціць там сваю палатку каштуе няшмат, а калі вы па натуры сваёй не «паходнік», правільна паставіць яе і распаліць агонь дапамогуць калі не працаўнікі кемпінгу, дык суседзі. Гэтым летам нават у дажджлівыя дні ахвотных прымераць на сябе вобраз Рабінзона там было дастаткова. Што яшчэ сказаць аб Свіцязі? Па апытанні аднаго з турапера-тараў у сетцы, большасць карыстальнікаў назвалі гэтае возера самым прыгожым беларускім вадаёмам. Магчыма, справа ў тым, што возера мае бездакорна правільную форму (хутчэй авальную, чым круглую) і ў атачэнні лясоў па яго берагах нагадвае каштоўны камень на зялёным аксаміце. Асабліва пры здымцы зверху — менавіта такіх фота Свіцязі шмат на турыстычных сайтах. А магчыма, на грамадскай думцы адбілася магія балады Міцкевіча «Свіцязь» аб патанулым аднайменным горадзе, сталіцы слаўнай краіны Туган, і яго прыгожых і гордых абаронцах. Дарэчы, археолагі пацвярджаюць: на месцы возера тысячы гадоў таму сапраўды было паселішча. Яшчэ адна версія паходжання абсалютна круглага (дакладней, авальнага) возера — для аматараў навуковай фантастыкі: маўляў, утварылася яно на месцы падзення метэарыта ў спрадвечныя часы, і метэарыт гэты так і ляжыць дзесьці там, пад пластом доннага пяску. Так гэта ці не, але, выкупаўшыся ў Свіцязі, сапраўды адчуваеш, што стаў крыху здаравейшы. Сыходзяць стомленасць і стрэс, паляпшаецца настрой — адзначаюць многія. Дарэчы, вада на Свіцязі заўсёды крыху цяплейшая, чым у сярэднім па вадаёмах краіны, — такі вось прыродны феномен. Таму турысты купаюцца нават у прахалодныя дні. А яшчэ навуковай сенсацыяй стала выяўленне сярод воднай расліннасці Свіцязі ўнікальнай водарасці Tetradinium javanicum: акрамя як тут, яна расце яшчэ толькі на востраве Ява. Абысці возера не складзе вялікай праблемы нават для зусім не спартыўнага вандроўніка: даўжыня берагавой лініі — усяго пяць з невялікім кіламетраў. У 1970 годзе возера Свіцязь і прылеглыя тэрыторыі былі абвешчаныя запаведнымі з мэтай захавання ўнікальнага ландшафту, раслін і жывёл, уключаных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. А статус рэспубліканскага заказнік атрымаў у 2007 годзе. Так што ёсць адзін мінус: да самай вады на машыне не пад'едзеш. Але для гарадскога чалавека гэта хутчэй не мінус, а плюс: ці так часта мы, не спяшаючыся, ходзім пешшу, удыхаючы чыстае лясное паветра?

Браславы, зразумела, у нашым топе. Асабліва любімыя беларускімі турыстамі **Дрысвяты** — гэта возера мае самую доўгую берагавую лінію з беларускіх азёр (61 км). Палаткі тут любяць ставіць каля самай вады: выйшаў з палаткі раніцай — і адразу акунуўся ў асвяжальную прахалоду. Наогул, Віцебшчына — выдатны напрамак, калі вы засумавалі па купаннях. Можна, напрыклад, адправіцца на **Лепельскае возера**. Праўда, яно вельмі глыбокае, але ёсць і спадзістыя ўваходы ў ваду: калі збіраецеся туды з дзецьмі, загадзя пагугліце, куды канкрэтна ехаць, бо возера вялікае — 40 кіламетраў берагавой лініі — не жарты. Вада, дарэчы, і тут гаючая — з высокім утрыманнем жалеза (пансіянат аднаго з медцэнтраў не дасць схлусіць, таму ён тут і размешчаны). А яшчэ ў Лепелі, напэўна, самая смачная ў Беларусі «малочка»: ад смятаны да сыркоў. Але гэта маё прыватнае меркаванне, калі хочаце — абвяргайце. Так што аздараўленне будзе яшчэ і смачнае.

ДАЛЁКА І БЛІЗКА

Дададзім у наш топ і **возера Сялява**. Па-першае, яно лічыцца адным з самых чыстых сярод азёр Беларусі, а па-другое, калі ўжо хочацца пагуляць у вышэйзгаданага Рабінзона, то ў нашай краіне гэта лепш за ўсё зрабіць менавіта на Сяляве. Тут ёсць тры астравы — праўда, улетку зусім не бязлюдныя: упадабанае месца стаянак рыбакоў і проста турыстаў. Нічога дзіўнага. Паставіць палатку на востраве — выдатны варыянт для рамантычных парачак. Ну, а калі вы сямейны чалавек і вам не да ўсіх гэтых глупстваў, то дзеці ад начлегу на востраве таксама прыйдуць у захапленне. Праўда, у абодвух выпадках прыйдзецца паклапаціцца аб лодцы — вырашыце пытанне загадзя.

Ну, а калі вы аддаяце перавагу руху на поўдзень нашай радзімы, то на Палессі можна адпраўляцца практычна на любы вадаём: там вельмі шмат прыгожых месцаў і — бонус — тэмпература паветра і вады прадказальна на пару градусаў вышэйшая, чым на Міншчыне і Віцебшчыне. Цікавая лакацыя — **возера** з японскай назвай **Каташы** (на самай справе КаташЫ, але няважна). Знаходзіцца яно непадалёк ад Кобрына (Хідрынскі сельсавет), і сюды традыцыйна едуць адпачываць брастаўчане, як мінчане — на Мінскае мора. Праўда, Мінскае мора штучнае і вельмі ўжо «ўрбанізаванае» — асфальт, альтанкі, мангалы і дзіцячыя гарадкі, а прырода — так, «у нагрузку». А тут усё натуральнае і прыроднае: гаючыя крыніцы з жывой вадой і дзюны дробнага пяску.

Вада на Свіцязі заўсёды крыху цяплейшая, чым у сярэднім на вадаёмах краіны — такі вось прыродны феномен.

Вілейскае вадасховішча — найбуйнейшы штучны вадаём Беларусі. Дабрацца да яго проста, спыніцца з палаткай — не праблема. Вадасховішча чыстае, ёсць такая-сякая інфраструктура для адпачывальнікаў. Асобна хочацца адзначыць на Вілейскім вадасховішчы лакацыю «Жоўты Бераг». Гэты кемпінг — традыцыйнае месца адпачынку сем'яў з маленькімі дзецьмі. Неглыбокая вада тут добра прагравецца. Выгоды, праўда, сціплыя: біяпрыбіральні, альтанкі і мангалы. Затое тут ціха пасля дзевяці вечара. І дабрацца сюды можна не толькі на машыне: даязджае на аўтобусе ці маршрутцы (іх тут ходзіць шмат) да прыпынку «Вёска Сасёнка», і да «Жоўтага Берага» застаецца ісці ўсяго нічога. Толькі не забудзьцеся на пітную ваду: тут яе купіць няма дзе. Праўда, можна набрацца са студні ў вышэйзгаданай вёсцы з ласкавай назвай.

Ну і, вядома, **Мінскае мора** — як без яго? Яно ж Заслаўскае вадасховішча, другі па велічыні штучны вадаём краіны. Можна прыехаць сюды з палаткай, можна — каб проста пагуляць і выкупацца. А можна, напрыклад, навучыцца віндсёрфінгу. А то і — бярыце вышэй — запісацца на курсы па кіраванні яхтай. Праўда, каштуюць яны нятанна і доўжацца не адзін тыдзень, але затое потым вы зможаце быць капітанам уласнай яхты. Няма яхты? Ну, ніхто не ведае, як жыццё павернецца, а веды за плячыма не насіць. Таксама да паслуг адпачывальнікаў — пракат сёрфаў з вяслом: яны не патрабуюць спецыяльнага навучання. Вакол Мінска сёлета магчымасцяў паспрабаваць сябе ў сёрфінгу ўвогуле шмат, як і катання на водных лыжах з трамплінамі і без — напэўна, мода на ўсё гэта набірае абароты. І наогул, з турыстычнай інфраструктурай тут парадак: ёсць практычна ўсё, чаго душа пажадае. А яшчэ тут праходзяць дыскатэкі — як у санаторыях для адпачывальнікаў, так і, напрыклад, на пляжы «Сябры» — каля вады для ўсіх ахвотных. А іх гэтым летам шмат: дзеці гарэзліва скачуць, мамы і таты танчаць па-рознаму: хто сарамліва ператупваецца з нагі на нагу, хто выплясвае ад душы. Тут жа можна купіць смачнага фастфуду, які трэба есці рукамі (але можна і відэльцам), і нават выпіць кактэйль або келіх віна. Адным словам, адчуй сябе ў Атананарыву. Уваход на дыскатэку бясплатны, ежа і алкаголь, зразумела, за грошы. І адносна нятанна. Але гуляць дык гуляць — адпачынак усё ж.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

След на зямлі

І Ў СВАЕ 100 ЁН ПА-РАНЕЙШАМУ ДАЕ ЎРОКІ!

...Знаёмства і кожная сустрэча з Уладзіславам Мікалаевічам ВАСІЛЬЕВЫМ — былым выкладчыкам нашага аграрна-тэхнічнага каледжа — рэдкая ўдача, а то і шчасце, бо ён заўсёды шчыры, сабраны, адказны, з выключным пачуццём гумару, з уменнем гаварыць душой... Зусім нядаўна, 5 жніўня, ветэрану вайны і педагагічнай працы споўнілася 100 (?!), і ці не ўсе гэтыя гады прысвечаныя стварэнню.

Калі пачалася Вялікая Айчынная, Уладзіслаў Мікалаевіч быў маладзейшым за сённяшніх навучэнцаў каледжа, жыў з сям'ёю на поўначы. У 1942-м, скончыўшы 10 класаў і Кузнецкае кулямётнае вучылішча, разам з іншымі выпускнікамі трапіў пад Ленінград, у Другую ўдарную армію генерала Уласава, а калі па шчырасці — то ў самае сапраўднае пекла. Навабранцам не хапала прадуктаў, абмундзіравання, боепрыпасаў, а Васільеву да таго ж не пашчасціла з вінтоўкай. «Яна няспраўная... Як быць?» — спытаў у «бацькоў-камандзіраў. — «Лепшую знойдзеш там», — сказалі яму ў адказ і паказалі ў той бок, дзе грымеў бой, дзе было шмат забітых і таварышаў, і ворагаў, дзе заставалася ўжо непатрэбная ім зброя.

У першы дзень верасня тога самага 1942-га Уладзіслаў Мікалаевіч быў паранены ў руку і досыць цяжка — у шыю. Аднак і ў гэткім стане (раненых было шмат) разлічваць мог толькі на сябе, на ўласныя сілы. І таму, нягледзячы ні на што, змог адолець начны 15-гадзінны пераход па забалочанай мясцовасці...

Пасля ранення яму доўга давялося ляжаць у шпіталі, многае перадумаць, канчаткова зразумець, як жа нялёгка забіваць людзей, хоць яны і ворагі.

Ветэрану да сёння цяжка ўспамінаць і час сваёй службы ў блакадным Ленінградзе, калі на суткі давалі 125 грамаў хлеба, калі...

Жахі блакады досыць падрабязна апісаны ў гістарычнай і мастацкай літаратуры. Іншая рэч — успаміны жывых людзей. Ва Уладзіслава Мікалаевіча дагэтуль у памяці, як гарэлі склады з прадуктамі харчавання, як плавіўся цукар, а людзі потым збіралі землю, на якую ён выцякаў, разводзілі вадой, гатавалі і пілі брудную салодкую вадкасць, каб хоць неяк падтрымаць сілы.

Калі ў горад прыехаў К. Я. Варашылаў, Уладзіславу Мікалаевічу давялося яго ахоўваць. Праз некалькі гадоў пасля вайны ён убачыў гэты сюжэт у фільме «Блакада».

...Пасля таго як яе прарвалі, стала хоць трохі лягчэй, але вайна працягвалася, і гінулі ў ёй не толькі гарады і людзі. Ветэран часта ўспамінае адно з наступленняў немцаў. Іх, ворагаў, паводле загаду камандавання, трэба было падпусціць як мага бліжэй. А ў лесе гармата страляе прама, і снарад часцяком трапляе ў дрэвы. Па словах ветэрана, вусцішна глядзець было, як яны тады падскоквалі і падалі на зямлю.

...У 1944-м франтавіка Васільева адправілі ў Ленінград на курсы, дзе рыхтавалі сакрэтную «каманду восем», якая збірала шыфравальную інфармацыю ворага. Зразумела, што курсантамі станавіліся толькі найлепшыя з найлепшых — тыя, хто заслужыў асаблівы давер.

Чым? Сваёй падрыхтоўкай, працай, учынкамі. Ва ўмовах вайны, як кажа ветэран, досыць хутка праяўляюцца характары, бо чалавек там проста не можа прыкідвацца...

Радасную вестку аб Перамозе Уладзіслаў Мікалаевіч пачуў будучы ў Прыбалтыцы, але дамоў вярнуўся толькі ў 1946-м і з моцна падарваным здароўем. Кантузіі і раненні, якія атрымаў на вайне, нагадвалі пра сябе яшчэ вельмі доўга. І ўсё ж ён дакладна ведае (і заўсёды кажа маладым), што ўсё ў яго жыцці атрымалася б значна горш, калі б ён быў слабым фізічна...

А таму нават сёння ветэран працуе над сабой, усе свае веды і ўменні старэецца перадаць маладому пакаленню. Балазе магчымасць такая ў яго заўсёды і ёсць, і была, бо пасля вайны Уладзіслаў Мікалаевіч паступіў у сельскагаспадарчы інстытут, скончыў факультэт земляробства і геадэзіі, стаў працаваць выкладчыкам у Мар'інагорскім сельскагаспадарчым тэхнікуме.

Сцены яго карпусоў і чытальнай залы дагэтуль упрыгожваюць карціны: Уладзіслаў Мікалаевіч усё жыццё маляваў мясцовыя краявіды, цудоўна фатаграфаваў. У яго пасёлку Мар'іна ды ваколіцах няма, відаць, ніводнай хаты, ніводнай сям'і, для якой бы мастак не рабіў фотаздымкаў...

У яго багатая бібліятэка, якую разам з сям'ёю збіралі ўсё жыццё. Выпускнікі ўспамінаюць, якім ён быў класным кіраўніком, як са сваёй групай ставіў, у прыватнасці, п'есу Васіля Гарбацэвіча «Чырвоныя кветкі Беларусі»: дэкарацыі ствараў сам, касцюмы шылі маці і жонка...

Але ж ці не галоўнай справай мірнага жыцця ветэран лічыць добраўпарадкаванне брацкай магілы ў сваім пасёлку. Гэтай справай ён займаўся разам з навучэнцамі і сакратаром камсамольскай арганізацыі Віктарам Паўлоўскім, каб захаваць памяць пра тых, хто стаў на абарону Радзімы і не сустрэў Перамогу.

...Яшчэ нядаўна Уладзіслаў Мікалаевіч і ў святы, і ў будні быў частым госцем у каледжы. Цяпер гасцей прымае сам: яго дзверы заўсёды адчынены для родных, сяброў і суседзяў, навучэнцаў каледжа, выкладчыкаў. І з кожным, хто заходзіць, гаспадар гатовы дзяліцца ўспамінамі, ведамі, досведам. Можна сказаць, што ён па-ранейшаму дае ўрокі — такія патрэбныя для годнага жыцця чалавека, якому дарагія яго сям'я і яго радзіма.

Алена Свірыдава,
выкладчыца,
г. Мар'іна Горка,
Пухавіцкі раён.

Перажытае — незабытае

ФРОНТ ЗА ЛІНІЯЙ ФРОНТУ

Ні ў адной краіне свету, ні ў адной рэспубліцы былога Савецкага Саюза ў час Другой сусветнай вайны не было столькі партызан, колькі ў Беларусі: сотні брыгад і атрадаў, у якіх змагаліся звыш 370 тысяч народных мсціўцаў: можна сказаць, сапраўдны фронт у тыле ворага...

У нашым раёне дзейнічала 18 партызанскіх палкоў, 9 брыгад. Наш зямляк (ураджэнец вёскі Пагост) Максім Іванавіч Жукоўскі адным з першых сярод народных мсціўцаў ва ўсім Савецкім Саюзе і ў першыя ж месяцы вайны быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

М. І. Жукоўскі.

Сярод партызан Бярэзіншчыны значыцца і грамадзянін Францыі Раман Дзюбаст. У Беларусь ён трапіў не па добрай волі: яго прымусілі надзець ваенную форму пад пагрозай пакараць родных, пагналі на ўсход, на ўдзел у карных экспедыцыях. Аднак пад нямецкім шынялём білася сэрца чалавека, які толькі чакаў зручнага моманту, каб перайсці на бок партызан. І такі выпадак надарыўся: хлопец стаў байцом атрада імя Шчорса.

Вясёлага і мужнага француза, які ніколі не хаваўся за спіны іншых, любіў спяваць савецкія песні (любімая — «Тры танкісты») і марыў пасля вайны вырошчваць буракі, хутка палюбілі партызаны. Але да светлага дня Перамогі ён не дажыў: 10 кастрычніка 1943-га нёс патрульную службу каля вёскі Марысіна, заўважыў на дарозе калону немцаў, адправіў таварыша ў штаб з данясеннем, а сам распачаў бой...

Імя адважнага партызана Рамана Дзюбаста значыцца на помніку ў скверы райцэнтра.

...Камандзірам партызанскай роты стаў былы чырвонаармеец Дзмітрый Барысавіч Шрэйн. На чале з ім для ўстанаўлення сувязі з ЦК КПБ і Беларускім штабам партызанскага руху ў Маскве адважныя партызаны перайшлі лінію фронту, абмінаючы варожыя гарнізоны, адолелі шлях у 600 кіламетраў.

Начальніку штаба Дзмітрый Барысавіч давёў тады інфармацыю аб дзеяннях партызан у Асіповіцкім раёне, пасля чаго тая ж група адважных — ужо з радысткай і радыёстанцыяй, з інструктарамі-падрыўнікамі — накіравалася назад у атрад.

Дз. Б. Шрэйн.

Баявы шлях Дз. Б. Шрэйна адзначаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені. У мірны час персанальны пенсіянер рэспубліканскага значэння працаваў у леспрамгасе, начальнікам Бярэзінскага сплаўучастка.

...На авіяцыю ў пачатку вайны партызаны разлічвалі мала, аднак з вясны 1942-га становішча стала мяняцца. Народныя мсціўцы Бярэзінска-Клічаўскай зоны прымалі грузы на аэрадроме каля вёскі Галынка, а дастаўлялі іх авіятары пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза гвардыі палкоўніка Валянціны Грызадубавай. «Што тут рабілася!» — пісаў пра пасадку першага самалёта былы партызан Мікалай Ратушнаў. Абдымкі, пацалункі, радасныя воклічы!.. У кожнага было жаданне не толькі бліжэй убачыць, але і дакрануцца да лётчыкаў, да самалёта, упэўніцца, што гэта не сон, а самая сапраўдная ява.

У ноч на 17 сакавіка 1943 года з тога ж аэрадрома Галынка экіпажам Сцяпана Запылёнава быў вывезены адмысловы стол, які ў вёсцы Нядашкава (непадалёк ад Магілёва) змайстраваў столяр-чырванадрэўшчык Якаў Арлоў. Яго мазаічныя самабытныя вырабы з розных парод дрэва адзначаліся ўзнагародамі на Сусветнай выстаўцы ў Парыжы, на Усесаюзнай сельскагаспадарчай — у Маскве... Да 25-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў падарунак Сталіну майстар вырашыў зрабіць двухтумбавы пісьмовы стол з адпаведным дароўным надпісам.

Вайна прыпыніла работу ўмельца, аднак фашысты нейкім чынам дазналіся пра схаваны ў хляве падарунак і вырашылі адправіць яго Гітлеру — загадалі былы надпіс змяніць на новы «Вялікаму фюрэру Гітлеру ад беларускага народа ў знак удзячнасці за вызваленне».

Фотаздымкі гэтага падарунка былі змешчаны ў нямецкіх газетах, з Берліна да Арлова прыязджалі нямецкія чыноўнікі, захапляліся. Акрамя стала запатрабавалі, каб Арлоў зрабіў для Гітлера і адмысловае крэсла.

Падарунак хацелі даставіць у Германію да дня нараджэння фюрэра, таму ўмельца, можна сказаць, не выпускалі з хаты... Але ж сакрэты ў вёсцы не жывуць. Патрыёты ўстанавілі сувязь з партызанскім атрадам. Дачакаўшыся ночы, народныя мсціўцы ўзвода разведкі Івана Пархаўчэнкі ў цемрані падышлі да хаты Арлова, знялі вартавога, стол разабралі, паклалі на санкі і разам з майстрам, які папрасіўся ў партызанскі атрад, выехалі з вёскі.

Фашысты былі раз'юшаны: каб вярнуць абяцаны падарунак Гітлеру, яны задзейнічалі сваю авіяразведку, прачэсвалі ўсе навакольныя лясы. Аднак пошукі аказаліся марнымі.

Пасля вайны замест дароўных надпісаў майстар зрабіў на стальніцы прыгожы арнамент і незадоўга да смерці перадаў свой шматпакутны твор у Магілёўскі абласны краязнаўчы музей.

Тамара Круталевіч,
г. Беразіно.

Чалавек — чалавеку

«БЕЗ МЯНЕ РАЗГУЛЯЕЦЦА ВОСЕНЬ...»

У мяне што ні жнівень, то балючы ўспамін: сёлета 23 гады як на вучэннях у Баранцавым моры затанула падводная лодка «Курск». Большасць падводнікаў загінула адразу, 23 чалавекі заставаліся ў жывых...

У той жа дзень мы, прыхаджане храма Святога Георгія Пераможцы, выпраўляліся ў паломніцкую паездку ў далёкае Дзівеева да бацюшкі Серафіма Сароўскага. У салоне аўтобуса быў тэлевізар для прагляду духоўных фільмаў, выпускаў навін. З іх і даведаліся, што адбылася трагедыя, сталі маліцца і, вядома ж, спадзявацца на лепшае.

Па прыездзе на месца за навінамі мог сачыць толькі бацюшка. Кожны дзень пасля літургіі ён расказваў, што адбываецца на субмарыне. Паведамленні былі сухія і кароткія, але ж надзея па-кульжыла...

Раніцой 19 жніўня, перад ад'ездам дамоў, мы сабраліся на богаслужэнне. У 12 гадзін яно завяршылася, але святары (24 чалавекі... у белым адзенні...) сталі выходзіць з алтара толькі ў 12 гадзін 30 хвілін. Пачалася незапланаваная паніхіда, і мы, вернікі, зразумелі ўсё...

Я стаяла з правага боку. У нейкі момант выцерла слёзы і здрыганулася, убачыўшы незвычайнае срэбнае свячэнне. Нібы сотні маленькіх сняжынак кружыліся ў паветры над галовамі святароў...

Трохі пазней я ім расказала пра гэта і пачула, што душы загінулых адразу ж узносяцца на Нябёсы. Ды і ці магло быць інакш у пакутнікаў нашага часу? А тады...

Мы плакалі, перажывалі сыход, уяўлялі, як жа цяжка іх родным!

Каб хоць нечым падтрымаць іх, па дарозе дамоў я напісала верш «Пісьмо да матулі». Мне здаецца, што сваёй актуальнасці ён не страціў і сёння.

Ты прабач мяне,
мамачка, мама!
Мы не стрэнемся
болей з табой
Каля нашай
вяргіневай брамы...
Пад старою
не сядзем вярбой.
Год за годам прайшлі
мае дваццаць,
Нібы кадры нямога кіно.
Не паспеў у каханні
прызнацца
Той, з якой сябравалі
даўно.
...Без мяне
разгуляецца восень:
Журавіны —
як кроплі крыві.
Сэрца ціха
і стомлена просіць:
— Ты не плач,
ты яшчэ пажыві!
...Вось і ўсё.
Замірае дыханне.
Вусны шэпчуць
ужо ў небыцці,
Як апошняе развітанне:
— Мама, ма...
Усё роўна
жыві!

Наталля Сівак,
в. Заполле,
Чэрвеньскі раён.

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Асцярожна, спякота!

КАБ ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ АД ПЕРАГРАВАННЯ...

У сувязі з гарачым надвор'ем Міністэрства аховы здароўя рэкамендуе прытрымлівацца пэўных правілаў. Вось асноўныя з іх.

Не выходзьце на вуліцу без асаблівай патрэбы з 11.00 да 17.00 падчас максімальнай сонечнай актыўнасці.

На вуліцы

Трымайцеся ў цені, перыядычна заходзьце ў памяшканні з кандыцыянерамі. Вазьміце з сабой бутэлечку негазаванай мінеральнай вады. Насіце свабоднае адзенне з натуральных тканін, адкрыты і камфортны абутак.

У памяшканні

• Пры наяўнасці кандыцыянера не астуджайце паветра ніжэй за 18—20 градусаў (каб пазбегнуць цяжкіх прастудных захворванняў, знаходзьцеся далей ад кандыцыянера);

• Пры адсутнасці кандыцыянера для астуджэння паветра выкарыстоўвайце ёмістасць з вадой, якая ставіцца перад вентылятарам.

Каб пазбегнуць абязводжвання

Піце больш вадкасці (пажадана не халоднай) — не меней чым 1,5—3 літры ў дзень, напрыклад воду з сокам лімона, цёплы зялёны чай без цукру, негазаваную мінеральную ваду, узвары і морсы. Выключыце са свайго рацыёну тлустыя, смажаныя і салодкія стравы.

Правілы асабістай гігіены

Старанна мыйце рукі з мылам пасля вяртання дадому з вуліцы, перад ежай і пасля наведвання туалета. Пры транспартаванні і захоўванні прадуктаў выкарыстоўвайце чыстую ўпакоўку (поліэтылен, паперу, кантэйнеры для харчовых прадуктаў), для скорапсавальных харчовых прадуктаў — сумку-халадзільнік або холадагенты.

Сачыце за прадуктамі, якія хутка псуюцца: мяснымі паўфабрыкатамі, салатай, тварагом, малаком, кандытарскімі вырабамі (пірожнымі).

Асаблівая ўвага — прадуктам

Пры куплі ўважліва кантралюйце тэрмін прыдатнасці і ўмовы іх захоўвання (пры заканчэнні тэрміну прыдатнасці або найменшым падазрэнні, што халадзільнае абсталяванне працуе неэфектыўна, прадукт набываць не варта). Прадукты, якія хутка псуюцца, неабходна купляць толькі ў гандлёвых аб'ектах, абсталяваных халадзільнікамі.

Важна памятаць, што пры парушэнні цэласнасці ўпакоўкі тэрмін прыдатнасці такіх прадуктаў, як правіла, значна скарачаецца.

Не купляйце замарожаныя прадукты (гэта адносіцца і да марожанага) у дэфармаванай упакоўцы са зліплым змесцівам (хутчэй за ўсё, яны падвяргаліся размарожванню).

У спякоту небяспечна купляць выпечку з мясным, агароднінным і сырным начыннем, чабурэкі, хачапуры, беляшы, булачкі з крэмам, пірожныя, калі для іх захоўвання не выкарыстоўваецца халадзільнае абсталяванне.

Падчас знаходжання на адпачынку не ўжывайце ваду з выпадковых крыніц для піцця і бытавых мэт, купайцеся толькі ў вадаёмах, дазволеных для арганізаванага адпачынку, пры купанні старайцеся не глытаць ваду, растлумачце гэта дзецям.

Пры першых сімптомах перагравання (вільготная счырванелая скура, слабасць, млявасць, дрымотнасць, галаўны боль, смага, пачашчэнне пульсу і дыхання, млоснасць) і прыкмет харчовага атручвання (болі ў жываце, ваніты, дыярэя) варта неадкладна звярнуцца да ўрача!

ЯК ЗБЕРАГЧЫ СПІНУ АД ТРАЎМАЎ

На думку спецыялістаў, падчас работы на прысядзібным участку існуе некалькі фактараў рызыкі, якія шкодзяць пазваночніку і суставам. Пастарайцеся іх пазбягаць.

Празмерныя нагрузкі

Клопатаў на ўчастку заўсёды шмат, і хочацца акультурыць яго як мага хутчэй, таму мы бяромся за справу заўзята, з энтузіязмам, працуем ударна і падоўгу. У гэтым не было б нічога страшнага, каб такая нагрузка была для нас звыклай. Але, на жаль, большасць сучасных людзей рухаецца мала, асабліва ў халодную пару года, таму мышцы часцей за ўсё бываюць «не ў форме». Перагрузка на такім фоне хутка прыводзіць да траўмаў, пашкоджанняў, абвастрэння астэахандрозу.

Як правільна?

Правільна разлічвайце свае сілы і рабіце ўсё паступова. Кожны дзень пачынайце з якой-небудзь лёгкай справы, і толькі выканаўшы яе, пераходзьце да больш складанай. Па сутнасці, тое ж самае мы робім на фітнес-трэніроўках: спачатку праводзім размінку, каб мышцы набылі эластычнасць, актывізавалася работа дыхальнай і сардэчна-сасудзістай сістэм, і толькі затым пераходзім да больш актыўных або складаных практыкаванняў.

Абавязкова чаргуйце работу і адпачынак. Нават калі зрабіць сёння трэба вельмі шмат, знайдзіце час на тое, каб спакойна пасядзець, прагуляцца ў спакойным тэмпе або прылегчы на гадзінку ў сярэдзіне дня.

Нефізіялагічныя позы

У большасці выпадкаў людзі працуюць на градках, сагнуўшыся ў тры пагібелі. Для пазваночніка гэта вельмі нефізіялагічна. У норме ў паясніцы ў нас ёсць невялікі прагін наперад. Калі мы згінаемся, гэтая частка пазваночніка, наадварот, пачынае вытыркацца назад. Да доўгага знаходжання ў такім становішчы не прыстасаваныя ні мышцы спіны, ні міжпазваночныя дыскі. Так што вынікам можа стаць абвастрэнне астэахандрозу, мышачны заціск і, як вынік, боль у спіне.

Як правільна?

Калі займацца праполкай вам трэба доўга, лепш за ўсё ўстаць для гэтага на карачкі, папярэдне надзеўшы наколенні. Для пазваночніка будзе не так шкодна, бо яго выгіны застаюцца натуральнымі, а нагрузка пераразмяркоўваецца на ўсё цела. Але нават у такім выпадку абавязкова чаргуйце пасіўныя заняткі з тымі, што патрабуюць большай рухавасці, даюць магчымасць разагнуць і разварушыць спіну. Абавязкова падбірайце даўжыню дзяржанняў рыдлёўкі, матыкі і іншых падобных прылад адпаведна свайму росту — гэта дазволіць вам не нахіляцца лішні раз і паберагчы пазваночнік.

Некамфортны сон

На лецішча мы часта адпраўляем тое, што ўжо не падыходзіць для гарадской кватэры: паношанае адзенне, якое страціла таварны выгляд, посуд і, вядома, старую мэблю. Апошняя можа саслужыць нам вельмі дрэнную службу.

Днём, калі мы працуем, міжпазваночныя дыскі адчуваюць павышаную нагрузку, таму губляюць частку вільгаці, становяцца больш плоскімі і менш пругкімі. Уначы, калі мы ляжым, яны, па задумцы прыроды, павінны натуральным чынам аднаўляцца. Аднак калі цела пры гэтым знаходзіцца ў нязручным становішчы, тое не адбываецца. Праціснутыя канапы і мяккія пярыны, якія людзі часта «высылаюць» на дачу, павялічваюць нагрузку на спіну, і міжпазваночныя дыскі хутчэй зношваюцца.

Як правільна?

Не эканомце на начным адпачынку. На лецішчы, як і ў гарадской кватэры, павінен быць зручны ложак, лепш за ўсё з артапедычным матрацам, які дазволіць расслабіцца стомленай за дзень спіне.

УСМІХАЙЦЕСЯ, ГЭТА ЎСІХ РАЗДРАЖНЯЕ

Якія прадукты неабходныя для здароўя зубоў

Усім вядома, што салодкае дрэнна ўплывае на зубы, чырвонае віно пакідае плямы на зубной эмалі. А вось якія прадукты дапамогуць зубам заставацца дужымі, прыгожымі і здаровымі? Пра тое, што трэба есці і як гэта правільна рабіць, каб зубы заставаліся здаровымі, расказала ўрач-стаматалагтэрапеўт 10-й гарадской стаматалагічнай паліклінікі Анастасія ГУНЬКО.

Здаровае харчаванне забяспечвае нам паўнацэнную жыццядзейнасць і нават садзейнічае прафілактыцы такіх захворванняў, як дыябет, хваробы сэрца, інсульт і рак. Штодзённы рацыён здаровага харчавання складаецца са злакаў, гародніны, збожжавых, бабовых, садавіны, мяса, яйкаў, рыбы, малочных прадуктаў і правільных тлушчаў. Аптымальныя суадносіны бялкоў, тлушчаў і вугляводаў у дарослых — 1:1:4.

— На сёння даказана вялікая роля правільнага харчавання і ў прафілактыцы ўзнікнення карыесу зубоў і запаленчых захворванняў поласці рота. Тканкі поласці — дзясна, зубы, язык, слізістая абалонка шчок — з'яўляюцца органамі-мішэнямі, высока адчувальнымі да недахопу пажыўных рэчываў у арганізме, — кажа стаматолаг.

Напрыклад, дэфіцыт бялкоў у дзяцей у перыяд развіцця зубоў прыводзіць да памяншэння іх памеру і масы, парушэння структуры эмалі, дэгенерацыі злучальнай тканкі дзясны і перыядантальнай звязкі, запавалення гаення ран і атрафіі эпітэлію языка. Залішняе спажыванне вугляводаў, асабліва простых, прыводзіць да павышанай успрымальнасці зубоў да карыесу.

У склад эмалі ўваходзіць каля 40 элементаў табліцы Мендзялеева, але асноўныя з іх кальцый, фосфар, фтор. Істотную ролю ў развіцці стаматалагічных захворванняў адыгрывае недастатковае паступленне кальцыю, які з'яўляецца мінеральнай асновай зубоў. Прычым важным паказчыкам стану эмалі з'яўляецца не толькі колькаснае паступленне ў арганізм гэтага мінеральнага кампанента, але і яго суадносіны з фосфарам, зніжэнне якога праяўляецца дэмінералізацыяй і пашкоджаннем тканак зуба. І, наадварот, чым вышэйшыя даныя суадносіны ў эмалі, тым больш яна ўстойлівая да неспрыяльнага дзеяння кіслот.

— Фтор валодае супрацькарыёзным дзеяннем, што тлумачыцца ўтварэннем у эмалі рэзістэнтных структур да дзеяння кіслот і прыгнечаннем кіслотаўтварэння мікраарганізмамі зубной эмалі. Пры ўтрыманні фтору ў пітной вадзе ў колькасці менш за 0,5 мг/л развіваецца яго недастатковасць, якая небяспечная павышанай захваральнасцю на карыес у насельніцтва. А лішак фтору праяўляецца крохкасцю зубоў і плямістасцю эмалі, якая называецца флюароз, — тлумачыць Анастасія Гунько.

Крыніцамі паступлення ў арганізм вышэйзгаданых мінеральных рэчываў з'яўляюцца наступныя прадукты:

• *кальцый* — малако і малочныя прадукты, арэхі, зеляніна, рыба;

• *фосфар* — гэтак жа малочныя прадукты, асабліва сыры, яйкі, бабовыя, мяса, рыба, ікра і хлебапрадукты;

• *фтор* — марская рыба, хлеб з мукі грубага памолу, арэхі, чай, мінеральная вада. Як правіла, 2/3 фтору засвойваецца з вады.

Вітаміны, якія ўдзельнічаюць у прафілактыцы захворванняў поласці рота, можна атрымаць з наступнымі прадуктамі харчавання:

• *вітамін С* — прадукты раслінnага паходжання: садавіна, ягады, гародніна;

• *вітамін* B_1 — хлеб, збожжавыя, бульба;

• *вітамін* B_2 — дрожджы, яечны бялок, малако, мяса, рыба, печань, ныркі;

• *вітамін* B_{12} — прадукты жывёльнага паходжання: печань, ныркі, свежае мяса, яечны жаўток, малако;

• *вітамін К* — печань жывёл і агародніна (капуста, шпінат, таматы, кавун, зеляніна);

• *вітамін D* — рыбін тлушч, печань рыб, ікра, чырвоная рыба, яйкі, малако, смятана.

У сучаснага чалавека самаачышчэнне поласці рота адбываецца не цалкам, бо значная частка нашай ежы мяккая, лёгка прыліпае і назапашваецца ў роце. Да прадуктаў, якія можна выкарыстоўваць для самаачышчэння, адносіцца ўся цвёрдая агародніна і садавіна: яблыкі, радыска, морква.

— Шматлікімі даследаваннямі даказана наяўнасць прамой сувязі паміж спажываннем цукру і ростам карыесу. Бо рэшткі ежы, якая ўтрымлівае простыя вугляводы, маюць уласцівасць затрымлівацца ў поласці рота, прыліпаючы да паверхняў зубоў, і расшчапляцца да арганічных кіслот (малочнай і піравінаградной), спрыяючы, такім чынам, растварэнню эмалі і развіццю карыесу. Каб гэтага пазбегнуць, мэтазгодна зменшыць частату спажывання вугляводаў, як і час знаходжання вугляводаў у поласці рота. Карысна будзе не ўжываць салодкае на ноч і не пакідаць яго апошняй стравай пры прыёме ежы, не есці салодкае паміж прыёмамі ежы. Але калі парушана якое-небудзь з правіл, неабходна пачысціць зубы ці прапаласкаць рот. Гэтыя рэкамендацыі не ўяўляюць складанасцяў і не патрабуюць матэрыяльных затрат, у сувязі з чым аптымальныя для людзей любога ўзросту, — рэзюмуе ўрач.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
16 жніўня 2023 г. № 29 (715)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ПУЛЬС СТАЛІЦЫ ЗБІВАЦЦА НЕ ПАВІНЕН

Якія задачы паставіла Наталля КАЧАНАВА перад кіраўніцтвам Мінска

Фота БелТА.

На пасяджэнні Мінскага гарвыканкама падвялі вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця сталіцы за першае паўгоддзе. Абмеркаванне прайшло пад кіраўніцтвам Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай, якая з'яўляецца ўпаўнаважаным прадстаўніком Прэзідэнта ў Мінску.

«Мы збіраліся па выніках квартала, дамаўляліся, што да паўгоддзя ўсё будзе зроблена, — задала тон размовы Наталля Качанава. — Не ўсе задачы выкананы. Аб'ектыўныя прычыны, якія не залежаць ад Мінгарвыканкама, Уладзімір Кухараў агучыў на пасяджэнні Саўміна. Лічу, што рэспубліканскія органы кіравання ў тым ліку абавязаны далучыцца. І ў найкарацейшыя тэрміны давесці паказчыкі».

Як адзначыў **старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ**, «забяспечылі дынаміку па ўсіх паказчыках, дынаміку нядрэнную, але праблемы ёсць».

Першы намеснік старшыні Надзея ЛАЗАРЭВІЧ, адзначыўшы станоўчыя моманты (добрая дынаміка па выхадзе з крызісу стратных прадпрыемстваў, рэнтабельнасць продажаў дасягнула больш як пяць працэнтаў, сярэдняя зарплата па Мінску дасягае 2,5 тысячы рублёў), назвала і праблемныя: «Напрыклад, ідзе рост складскіх астаткаў. Дынаміка росту недапушчальная, паколькі ёсць павышаны попыт на нашы тавары. Таму будзем акцэнтаваць увагу профільных міністэрстваў, каб звярнулі ўвагу на пэўныя прадпрыемствы, у якіх цяпер рост па складскіх астатках, — адзначыла яна. — Добрая дынаміка ў нас па рабоце з выплатай заработнай платы. Так, ёсць шэраг прадпрыемстваў, якія не паспяваюць у апошні дзень месяца закрыць заработную плату. Але мы разумеем, што з 15 прадпрыемстваў, якія лічацца ў статыстыцы па незакрытых у заработнай плаце, 11 — гэта прадпрыемствы, якія знаходзяцца ў санацыі — банкруцтве. А два-тры — у розныя месяцы ўзніклыя прадпрыемствы, з якімі мы працуем кропкава і на працягу двух тыдняў закрываем пытанне з заработнай платай. Гэта значыць, працуем у ручным рэжыме з усімі суб'ектамі гаспадарання».

Наталля Качанава па кожнай тэме абмеркавання паставіла перад кіраўніцтвам горада канкрэтныя задачы, якія павінны быць выкананы.

Больш актыўна павінны працаваць кіраўнікі прадпрыемстваў сталіцы

«Будзе сур'ёзная размова і сур'ёзна спытаем. Прэзідэнт нашай краіны дакладна паставіў задачу па выкананні прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця, — падкрэсліла спікер. — Трэба сёння рабіць усё магчымае і немагчымае, не трэба спасылацца ні на якія санкцыі. Забудзьцеся аб гэтых санкцыях, для вас яны не існуюць, вы павінны працаваць як трэба». «Сёння час магчымасцяў. Аб гэтым Прэзідэнт гаварыў шмат разоў, — сказала Наталля Качанава. — Таму павінен быць самы жорсткі запыт з кожнага за тое, чым ён займаецца. Кожны за сваё прадпрыемства павінен адказваць. Размова па дзевяці месяцах будзе вельмі сур'ёзная. Павінны быць зроблены ўсе меры для выканання прагнозных паказчыкаў».

«Трэба, каб у Мінску была дастойная заработная плата. І людзі атрымлівалі зарплату, якую яны зарабілі», — паставіла задачу Старшыня Савета Рэспублікі.

Аб'екты незавершанага будаўніцтва павінны быць на пастаянным кантролі

«Што да будаўніцтва жылля і перспектыў — дакладна трэба ведаць, як мы плануем развіваць горад Мінск з улікам генплана, той дэмаграфічнай сітуацыі, якая будзе складвацца. Гэта павінна быць сур'ёзная прапрацоўка», — адзначыла Наталля Качанава.

Паводле слоў спікера, важна ведаць канкрэтныя тэрміны ўводу аб'ектаў звышнарматыўнага будаўніцтва. «Вы дакладна скажыце людзям — калі ўведзяце аб'ект, і прапішам у рашэнні выканкама. Гэта ваша ацэнка работы. Аб'екты незавершанага будаўніцтва — на кантролі ў Прэзідэнта, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Гэта задача ў тым ліку кіраўнікоў адміністрацый раёнаў».

Рыхтаваць кадры павінны пад патрэбы эканомікі

«Сёння дзяржава выдзяляе вялікія сродкі на адукацыю. І трэба максімальна эфектыўна выкарыстоўваць бюджэтныя сродкі», — адзначыла Наталля Качанава.

Паводле слоў спікера, не менш важнае пытанне — далейшы лёс выпускнікоў ВНУ. «Галоўнае сёння — думаць, што будзе з маладымі людзьмі і куды яны пойдуць пасля навучання, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Задача Прэзідэнтам пастаўлена адназначная: кожны выпускнік павінен атрымаць рабочае месца. Мы павінны рыхтаваць кадры пад патрэбы эканомікі».

Паводле БелТА.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Рэгуляванне цэн, ушанаванне хлебаробаў, звароты грамадзян

У дзейнасці сенатараў — шырокі спектр

Старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ правяла рабочую сустрэчу, на якой разгледжаны падыходы да аналізу фінансавага стану арганізацый гандлю (ад буйных сетак да крам крокавай даступнасці). Сабраная інфармацыя будзе выкарыстана для выпрацоўкі прапаноў па карэкціроўцы дзейнай сістэмы рэгулявання цэн. У абмеркаванні прынялі ўдзел старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта Іна Мядзведзева, работнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю.

***

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Каліна КАПУЦКАЯ правяла прамую тэлефонную лінію для жыхароў Маладзечанскага, Мядзельскага і Вілейскага раёнаў Мінскай вобласці. Звароты, якія паступілі, датычыліся розных абласцей дзейнасці: стварэнне ў горадзе Маладзечне аматарскага духавога аркестра, аказанне дапамогі ва ўладкаванні дзяцей у дашкольную ўстанову адукацыі ў крокавай даступнасці. Грамадзяне таксама прасілі даць тлумачэнні аб магчымасцях здачы ўнаём непрыватызаванага жылля, аказаць садзейнічанне ў рэканструкцыі помніка воіну-інтэрнацыяналісту Рыгору Маскалевічу і памятнага знака воінам-інтэрнацыяналістам. Пытанні ў сферы працаўладкавання паступілі з Вілейкі. Жыхар Мядзела прапанаваў унесці змены ў нарматыўныя прававыя акты, якія датычацца аказання спонсарскай дапамогі юрыдычнымі асобамі. Усім, хто звярнуўся, дадзены адпаведныя тлумачэнні. Пытанні, якія патрабуюць дэталёвага разгляду, узяты на кантроль.

***

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Аляксандр КАРПІЦКІ падчас наведвання Камянецкага раёна павіншаваў перадавікоў уборачнай кампаніі. Сенатар уручыў працаўнікам ААТ «АграНіва» — механізатару Уладзіміру Нушчыку і брыгадзіру паляводчай брыгады Валянціне Хведарук — памятныя падарункі. «Сёння кожны жыхар нашай краіны ўдзячны вам за вашу працу. Яна сапраўды неацэнная. Дзякуючы вам мы маем хлеб на стале — галоўнае багацце. Няхай вам спадарожнічаюць добрае надвор'е, выдатны баявы настрой. І калі ваяваць, то толькі за ўраджай!» — адзначыў парламентарый.

***

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Аляксей КУШНАРЭНКА наведаў з рабочым візітам філіял СП «Газавік-Сіпакава» РУП «Магілёўаблгаз». Падчас візіту сенатар азнаёміўся з ходам работ па будаўніцтве новага зернесушыльнага комплексу. Новы сучасны комплекс прадукцыйнасцю 60 тон за гадзіну і ёмістасцямі для захоўвання збожжа на 5 тыс. тон дазволіць скараціць тэрміны ўборкі і дапрацоўкі збожжа, выдаткі на дапрацоўку збожжа, транспартныя перавозкі, што істотна знізіць сабекошт работ, а таксама забяспечыць падачу збожжа ў камбікормавы цэх у аўтаматычным рэжыме, замкнуўшы ланцужок тэхналагічнага цыкла перапрацоўкі.

СЛОВА СЕНАТАРАМ

У НАШЫМ СВЕЦЕ ЎСЁ ЎЗАЕМАЗВЯЗАНА. ВАРТА ПРА ГЭТА ПАМЯТАЦЬ

Галоўная тэма на парадку дня ў нашай краіне — уборачная кампанія. І гэта зразумела і заканамерна: ад харчовай бяспекі залежыць бяспека і незалежнасць дзяржавы ўвогуле. Беларусы ў гэтым плане могуць быць спакойныя: будзем з хлебам. Чаго не скажаш аб многіх іншых дзяржавах, дзе небяспека харчовага крызісу, а то і голаду, становіцца ўсё большай. Прычын на тое нямала, але ёсць і відавочныя, якія ўзніклі менавіта з-за палітыкі, — выхад Расіі са збожжавай здзелкі з-за парушэння яе ўмоў іншымі бакамі, санкцыі, якія былі ўведзены ў адносінах да беларускіх калійных угнаенняў. Члены Савета Рэспублікі падзяліліся сваімі меркаваннямі з гэтай нагоды і бачаннем выхаду з няпростай сітуацыі.

Аляксандр ЛЯХАЎ, член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:

— Заявы аб тым, што рашэнне Расіі выйсці з харчовай здзелкі нібыта паставіць пад пагрозу харчовую бяспеку ўсяго свету, гучаць няшчыра і не адлюстроўваюць рэальнай сітуацыі. На першы погляд, заходнія і амерыканскія палітыкі клапоцяцца аб добрай справе — абаронe інтарэсаў людзей, асабліва жыхароў бедных краін. Аднак калі ўдумацца ў сутнасць пытання, стане зразумела, што менавіта санкцыйнае супрацьстаянне ламае існуючыя ў свеце эканамічныя і лагістычныя ланцужкі.

А санкцыі ў адносінах да беларускіх калійных угнаенняў ствараюць прамую пагрозу сусветнага голаду. Беларусь з'яўляецца важкім гульцом на глабальным рынку менавіта гэтага віду ўгнаенняў. І наша адсутнасць там стварае дэфіцыт і рост цэн на іх. Адпаведна скараціласа выкарыстанне калійных угнаенняў, у выніку ўжо знізілася ўраджайнасць, выраслі цэны на прадукты харчавання па ўсім свеце. І гэта толькі пачатак. Далей праблемы будуць нарастаць як снежны камяк, наносячы ўдар у першую чаргу па найменш абароненых краінах. Не варта забываць са і на тое, што санкцыі прыводзяць да парушэння даверу і супрацоўніцтва на міжнародным узроўні. Падвяргаюцца рызыцы доўгатэрміновыя кантракты і ўзаемавыгадныя адносіны паміж многімі краінамі.

Каб разарваць гэтае заганнае кола, неабходна пачаць канструктыўны дыялог, каб, выключыўшы санкцыі і бар'еры, забяспечыць устойлівасць тавараправодных ланцужкоў для харчавання і ўгнаенняў. Гэта будзе на карысць усім.

Фелікс ЯШКОЎ, член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:

— Недахоп харчавання ў XXI стагоддзі, насуперак разумнаму сэнсу і інстынкту самазахавання, набыў рысы рукатворнай праблемы. А менавіта стаў справай рук заходніх і празаходніх гора-палітыкаў, якія, патураючы ўласным амбіцыям, стварылі штучныя пагрозы харчовай бяспецы ва ўсім свеце.

Адным з асноўных фактараў яе забеспячэння павінна стаць публічнае прызнанне сусветнай супольнасцю бясспрэчнай ролі Беларусі ў пытанні захавання высокага ўзроўню вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, у тым ліку за кошт выкарыстання для ўласных патрэб, а таксама паставак на экспарт нашых калійных угнаенняў. Незаконныя санкцыі ў дачыненні да нашых калійных угнаенняў, абмежаванне іх экспарту і іншыя перашкоды па прасоўванні на міжнародным рынку падрываюць развіццё аграрных гаспадарак многіх краін і, як вынік, перашкаджаюць задавальненню попыту на сельскагаспадарчую прадукцыю.

Неадназначную ролю ў гэтай сітуацыі адыграла і збожжавая здзелка. Заканамерна і чакана, што яе напаткаў лёс Мінскіх пагадненняў — прадстаўнікі Захаду зноў пусцілі пыл у вочы сусветнай супольнасці, у аднабаковым парадку парушаючы прынцыпы дамоўленасцяў з Расіяй. Тым самым прадэманстраваўшы свае сапраўдныя намеры дзейнічаць выключна ва ўласных інтарэсах, разыгрываючы зацягнутую палітычную інтрыгу перадзелу сусветнага парадку.

У безумоўным, але абсалютна амаральным выйгрышы апынуліся краіны Захаду, перанакіраваўшы амаль усю плынь танната збожжа для задавальнення ўласных патрэб, тым самым пазбавіўшы найбяднейшыя, у першую чаргу афрыканскія, краіны шанцаў на выратаванне ад галоднага крызісу, дзеля чаго збожжавае пагадненне і складалася. Пры гэтым сапраўдным блюзнерствам выглядала патэнцыяльная, а не выключана і цалкам рэальная, магчымасць выкарыстання гуманітарнага калідора збожжавай здзелкі для выгаднага вырашэння Украінай сваіх ваенных пытанняў.

Спадзяюся, што ў ААН уважліва прааналізуюць утоеныя сэнсы, дваістыя пасылы і фіктыўныя дамоўленасці, якімі напоўнены дзеянні заходніх палітыкаў у сферы сусветнай эканомікі, з мэтай перашкодзіць нарастанню тэндэнцыі да харчовага гвалту ў дачыненні да простага насельніцтва найбяднейшых краін.

Тамара ШАТЛІКАВА, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве:

— Санкцыі і абмежаванні на пастаўку прадуктаў харчавання і харчовай сыравіны, угнаенняў і іншай неабходнай для развіцця сельскай гаспадаркі прадукцыі з боку краін Захаду ў многім сталі прычынай сусветнага харчовага крызісу, які пагаршаецца. Ствараецца ўражанне, што тыя, хто задумаў гэтую гульню, самі не ўяўлялі, да чаго могуць прывесці такія дзеянні. Адчуўшы ў сваіх краінах дэфіцыт харчавання, рост цэн і сацыяльную стабільнасць, якая пахіснулася, моцныя гэтага свету пачалі ліхаманкава шукаць шляхі выхаду з сітуацыі, якая склалася. І нічога лепшага, чым вырашыць свае праблемы за кошт іншых, не прыдумалі. Пад прыкрыццём збожжавай здзелкі запоўнілі ўласныя склады збожжам, а тыя краіны, якім нібыта павінны былі адгружаць гэта збожжа, засталіся фактычна ні з чым.

Натуральна, што харчовы крызіс закранае найперш эканамічна слабыя дзяржавы, з абмежаванымі зямельнымі рэсурсамі і хуткім ростам насельніцтва. І мы бачым, колькі правальнай у палітычным плане для Захаду аказалася гэтая харчовая афёра, на фоне дамоўленасці Расіі з афрыканскімі краінамі па пытаннях паставак расійскага збожжа на саміце «Расія-Афрыка», які адбыўся ў канцы ліпеня ў Санкт-Пецярбургу.

Ужо прызнана, нават нашымі нядобразычліўцамі, што Беларусь з'яўляецца найбуйнейшым вытворцам прадуктаў харчавання ў Еўропе з вялікім экспартным патэнцыялам недарагой і якаснай прадукцыі. Але! Адкрыць свой рынак для беларускіх прадуктаў харчавання, адмяніць незаконныя санкцыі на пастаўку нашых калійных угнаенняў, аднавіць нармальныя дыпламатычныя адносіны, з пункту гледжання Захаду, — гэта ўпасці тварам у гразь, прызнаць памылковасць сваёй палітыкі. Ну што ж, гэта іх справа, іх людзі, іх будучыня.

Беларусь гарантавала харчовую бяспеку для сваіх грамадзян і шукае новыя рынкі збыту прадукцыі, у тым ліку і на афрыканскім кантыненце. Будзем супрацоўнічаць і гандляваць з тымі, хто падтрымлівае наш суверэнітэт, бачыць у нас раўнапраўных партнёраў. А тым, хто хоча мець выгаду за кошт праблем у іншых, трэба памятаць, што ў нашым глабальным свеце ўсё ўзаемазвязана.

Сяргей АНЮХОЎСКІ, член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:

— Яшчэ ў пачатку года многія еўрапейскія краіны ўвялі меры па абмежаванні на імпарт украінскага збожжа. Пры гэтым украінскія ўлады па-ранейшаму прадавалі збожжа, экспартуючы яго па марскіх шляхах. Разумеючы гэта, кіраўніцтва Расіі заявіла аб канчатковым выхадзе са збожжавай здзелкі. Пры гэтым Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін на саміце «Расія — Афрыка» заявіў, што Расія гатова ў найбліжэйшыя 3-4 месяцы бязвыплатна выдзеліць 6 дзяржавам Афрыкі па 25—50 тысяч тон збожжа, забяспечыўшы яго бясплатную дастаўку.

Пасля гэтага прыкметна актывізаваліся намаганні многіх зацікаўленых бакоў, у тым ліку Генеральнага сакратара ААН, урада Турцыі і іншых, заахвоціць Расію вярнуцца ў збожжавую здзелку і аднавіць рух суднаў па Чорным моры. Нават Папа Рымскі Францішак зрабіў заяву на гэты конт.

Процідзеянне санкцыйным мерам у пытаннях блакіравання паставак беларускага калію — найважнейшая задача для нашай краіны на сусветнай арэне. Важна разумець, што нельга зводзіць пытанне харчовай бяспекі толькі да пытання выканання збожжавай здзелкі — трэба думаць шырэй. Рэспубліка Беларусь, якая забяспечвае каля 20 працэнтаў паставак гэтых угнаенняў у свеце, гатова іх даць краінам, што маюць у гэтым патрэбу, таму пытанне зняцця санкцый з экспарту беларускіх угнаенняў павінна быць вырашана неадкладна.

Фота БелТА.

АМНІСТЫЯ НА НЕРУХОМАСЦЬ

Як яна працуе на месцах

Дом у сельскай мясцовасці, лічы, — падарунак лёсу. Ёсць месца, дзе можна перазараджацца і адпачываць душой. Праўда, калі з яго афармленнем і легалізацыяй усё нармальна. Вось ужо болей чым паўгода дзейнічае Указ Прэзідэнта № 202. Ён дазваляе спрасціць працэдуру ўзвядзення і рэканструкцыі аднакватэрных жылых дамоў і гаспадарчых пабудоў у сельскай мясцовасці. А тыя, у каго ёсць участкі, могуць будаваць без бюракратычных правалокаў — указ адмяняе шэраг абавязковых раней узгадненняў і максімальна спрашчае прыёмку аб'ектаў. У дапамогу насельніцтву яшчэ адзін Указ № 253 «Аб спрошчаным парадку прыёмкі ў эксплуатацыю аб'ектаў будаўніцтва». Яго ўжо назвалі за вочы «амністыяй на нерухомасць». Ён дазваляе ўладам прымаць незаконна пабудаваныя або рэканструяваныя дамы і гаспадарчыя пабудовы, але выключна да 1 студзеня 2025 года. Хто не паспее «легалізавацца», будзе па-ранейшаму лічыцца парушальнікам, а яго маёмасць — самабудам. Карэспандэнт «МС» пацікавілася, як працуюць новыя правілы на месцах.

— Гэта вельмі каштоўны падарунак жыхарам сельскай мясцовасці, — адзначае **галоўны спецыяліст аддзела архітэктуры і будаўніцтва Магілёўскага райвыканкама Жанна ВАЛЬКОЎСКАЯ**. — Указам № 253 спрошчаны парадак узаконьвання дома, не патрэбна праектна-каштарысная дакументацыя. Дакумент дазваляе прыняць у эксплуатацыю ўсё, што было зроблена да 1 верасня 2022 года — моманту пачатку дзеяння ўказа.

Што для гэтага трэба ад уласніка? Заява, дакумент аб праве ўласнасці на зямельны ўчастак, ведамасць тэхнічных характарыстык. Акрамя гэтага, патрэбна згода ўсіх паўналетніх грамадзян і ўдзельнікаў мэтавай уласнасці, якія маюць права на маёмасць. Аддзел архітэктуры і будаўніцтва райвыканкама, куды трэба звяртацца, разглядае зварот на працягу месяца.

Па словах Жанны Валькоўскай, асноўныя складанасці, якія ўзнікаюць, звязаны з урэгуляваннем пытанняў па зямельных участках. Або калі пабудовы знаходзяцца ад суседняга ўчастка на адлегласці меншай, чым дазваляюць нормы. У такім выпадку спатрэбіцца згода яшчэ і суседа.

З 1 верасня мінулага года і да жніўня гэтага ў Магілёўскі райвыканкам звярнулася ўсяго 100 грамадзян, каб узаконіць сваю маёмасць. Чыноўнікаў гэта крыху здзіўляе, яны спадзяюцца, што працэс запавольваўся з-за вырашэння грамадзянамі зямельных пытанняў і інвентарызацыі. Бо, перад тым як ісці ў райвыканкам, трэба спачатку атрымаць ведамасць тэхнічных характарыстык на капітальныя пабудовы ў Агенцтве па нерухомасці і зямельным кадастры. Тут жа будзе адлюстроўвацца стан зямельнага ўчастка і размяшчэнне капітальных пабудоў на ім.

Народ пайшоў у райвыканкам са студзеня, а да гэтага назіралася часовае зацішша. На 1 ліпеня ў Магілёўскім раёне ўведзена ў эксплуатацыю няўлічанай маёмасці ў памеры 1797,3 метра квадратнага.

Намеснік старшыні Магілёўскага райвыканкама Ірына КУРАШОВА лічыць, што хутка і па 202-м Указе адбудзецца ажыўленне.

— Нарматыўны дакумент толькі пачынае дзейнічаць, — кажа яна. — Ёсць разуменне, як працаваць. У працэсе ўзнікаюць рабочыя моманты. Безумоўна, вынік будзе, але не адразу. Так было спачатку з Указам 116, а калі ўсё ўстала на свае рэйкі, справа пайшла. Сёння аграгарадок Семукачы лічыцца адным з найлепшых у краіне па рабоце з гэтым указам.

Што датычыцца Указа № 202, то тут трэба весці тлумачальную работу. Калі людзі зразумеюць пасыл гэтага нарматыўнага дакумента, яны пойдуць да нас. Але можна смела казаць, што дакумент добры ўжо тым, што пазбавіў ад залішняй папяровай валакіты. Цяпер галоўнае толькі — жаданне грамадзян.

Старшыня Кадзінскага сельсавета Ганна НОВІКАВА актыўна працуе па Указе № 202.

— Нам перадалі алічбаваную карту раёна, на якой відаць, дзе ёсць парушэнні па зямельных участках, — распавяла яна. — Мы паслалі лісты болей чым 150 жыхарам сельсавета, але звярнулася толькі 11 уласнікаў з розных населеных пунктаў. Да 1 верасня 2025 года можна афарміць участак за палову кошту. Жыхарам той жа Вялікай Бароўкі, дзе высокі кадастравы кошт зямлі, гэта вельмі выгадна. Але пакуль да нас не спяшаюцца.

Ёсць выпадкі наогул заблытаныя. Напрыклад, маёмасць цалкам афармленая, ёсць нават адрас, але дом фактычна знаходзіцца за межамі населенага пункта. Як быць? На нашым узроўні такое не вырашаецца. Або такі прыклад. На тэрыторыі сельсавета ёсць вёскі, дзе зямельныя ўчасткі абмяжоўваюцца 25 соткамі. А ў некаторых, напрыклад, 28 сотак. Тут праблема вырашаецца з дапамогай зямельнай службы.

Афармленне зямельнага ўчастка — справа абавязковая. У тым ліку і для тых, каму дастаўся бацькоўскі дом з воднамі ў бязмежны сад. Раней участкі перадаваліся ў пажыццёвае карыстанне. Сёння павінна быць рэгістрацыя.

— Летась на тэрыторыі сельсавета пад абслугоўванне былі афармлены 173 участкі, а сёлета — ужо 86, — расказвае **старшыня Семукацкага сельсавета Тамара УКРУЖСКАЯ**. — Зямля павінна быць афармлена пад абслугоўванне. І калі гэта ігнараваць, можна атрымаць штраф за незаконнае выкарыстанне зямельнага ўчастка. Калі ўстанаўліваем, што зямля не афармленая належным чынам, чалавек нясе адміністрацыйную адказнасць за яе выкарыстанне без дзяржрэгістрацыі. І вымяраецца яна не адной базавай велічынёй.

Нягледзячы на тое што апошнія нарматыўныя дакументы робяць адчувальныя паслабленні для будаўніцтва, рэканструкцыі і рэгістрацыі сялян, заўсёды будуць узнікаць пытанні, якія патрабуюць асаблівай прапрацоўкі. Нядаўна на прыёме губернатара Анатоля Ісачанкі пабывалі жыхары аграгарадка Буйнічы, якім Магілёўскі райвыканкам адмовіў у змене мэтавага прызначэння зямельнага ўчастка. Год таму сям'я купіла побач са сваім агародам сем сотак у якасці асабістай падсобнай гаспадаркі, а пасля вырашыла пабудаваць на ім дом і змяніць мэтавае прызначэнне ўчастка. На першым іх участку ўжо стаяць два ўзаконеныя дамы. Як тлумачаць раённыя ўлады, пры будаўніцтве трэцяга будзе заблакіраваны праезд да аднаго з іх.

— Памяняць мэтавае прызначэнне ўчастка можна пры ўмове, што ёсць святло, вада і пад'езд, — тлумачыць **начальнік упраўлення землеўпарадкавання Магілёўскага райвыканкама Віктар СЦЕПАНЕНКА**. — Пытанне разглядае камісія, створаная пры райвыканкаме. Так робіцца заўсёды, калі пытанне спрэчнае.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
Магілёўскі раён.

ПОРЦЫЯ ЗДАРОЎЯ І ПРЫЕМНЫ БОНУС

Новы сацыяльны аб'ект, першы такі ў краіне, адкрыўся ў Веткаўскім раёне

Жыхары аграгарадка Хальч Веткаўскага раёна змогуць цяпер сваім прыкладам паказаць, як у сельскай мясцовасці імкнуцца сачыць за здароўем. Тут пачаў работу першы ў краіне пункт здароўя. Ён адкрыўся на базе фельчарска-акушэрскага пункта. Практыку плануюць распаўсюджваць і ў іншых рэгіёнах краіны.

Вельмі папулярныя ў жыхароў аграгарадка кіслародныя кактэйлі. Яны на спецыяльным абсталяванні гатуюцца тут жа.

Хальч — самы буйны сельскі населены пункт Веткаўскага раёна. Тут практычна паўтары тысячы насельніцтва, трэцяя частка жыхароў — пажылыя людзі. **Старшыня Хальчанскага сельвыканкама Валерый ЖОЛУДЗЕЎ** ад імя ўсіх жыхароў падзякаваў за тое, што пункт здароўя адкрыты менавіта тут, у Хальчы. Важнасць аб'екта цяжка пераацаніць. Гэта прыклад таго, як праводзіць вольны час з карысцю, весці актыўны спосаб жыцця і паляпшаць яго якасць, перакананы кіраўнік сельсавета. А яшчэ наведванне пункта здароўя — крок да пашырэння дыспансерызацыі вяскоўцаў.

— Насельніцтва ў нас вельмі актыўнае. Людзі хочуць берагчы сваё здароўе. Вы не ўяўляеце, як яны рады, што менавіта ў іх аграгарадку адкрылі такі пункт, — перадае эмоцыі сваіх пацыентаў **загадчыца Хальчанскага фельчарска-акушэрскага пункта Надзея КОРШЫКАВА**.

Тут можна правесці апаратны масаж, памераць артэрыяльны ціск, вызначыць індэкс масы цела, правесці пульсаксіметрыю. Між тым, цікавы падобны досвед і ў плане занятасці сельскіх спецыялістаў медзвяна. Так, загадчыца Хальчанскага ФАПа Надзея Сяргееўна ў пункце здароўя дадаткова працаўладкавана на паўстаўкі медыцынскай сястрой. Для медыка гэта дапаўненне да асноўнай зарплаты і дадатковы стымул для работы ў вёсцы ў тым ліку для маладых спецыялістаў, калі такія пункты будуць распаўсюджвацца. Уведзеныя паўстаўкі

аплачваюцца за кошт Беларускага Чырвонага Крыжа.

— Гэта пілотны праект і першы вопыт і ў рэгіёне, і ў краіне, — звярнуў увагу **генеральны сакратар Беларускага Чырвонага Крыжа Дзмітрый ШАЎЦОЎ**. — Сёлета каманда Беларускага Чырвонага Крыжа наведала Ульянаўскую вобласць Расійскай Федэрацыі, дзе мы азнаёміліся з укараненнем падобнага досведу і вырашылі, што яго можна паспрабаваць рэалізаваць у выглядзе пілотнага праекта і ў нас.

Вопыт Гомельскага рэгіёна ў далейшым будзе распаўсюджаны і ў іншых рэгіёнах краіны.

— Мы ўвесь час шукаем новыя формы, якія паляпшаюць якасць жыцця людзей, асабліва на вёсцы. Гэта вельмі важны праект для жыхароў сельскай мясцовасці. Мяркуем, што новыя пункты стануць добрай базай для таго, каб чалавек не толькі мог палепшыць сваё самаадчуванне, але ў цэлым весці здаровы спосаб жыцця, — падкрэсліла **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа Ала СМАЛЯК**.

Сенатар адзначыла, што ініцыятыва, рэалізаваная на Гомельшчыне, узгоднена з Міністэрствам аховы здароўя. Падчас апошняга візіту ў Гомельскую вобласць міністр аховы здароўя адзначыў, што медыцынская служба краіны, безумоўна, зацікаўленая, каб такіх пунктаў здароўя ў рэгіёнах было як мага больш.

— Мы параўнаем, наколькі будуць запатрабаваныя паслугі пунктаў здароўя на прыкладзе Веткаўскага раёна і Рагачова. Прааналізуем, як будуць адгукацца на паслугу людзі. Магчыма, варта сканцэнтраваць такую дапамогу менавіта ў вёсцы, — дадала член Савета Рэспублікі.

Як адзначыла Ала Смаляк, яе асноўная работа кіраўніка абласной арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа і дзейнасць у якасці сенатара шмат у чым перапляталіся.

— Падчас прамых тэлефонных ліній і прыёмаў грамадзян жыхары Гомельскай вобласці звяртаюцца з самымі рознымі жыццёвымі пытаннямі. У тым ліку адрасуюць пытанні аказання медыцынскай і рэабілітацыйнай дапамогі. Менавіта работа са зваротамі грамадзян, дапамога людзям у вырашэнні іх надзённых пытанняў, падтрымка ў прадастаўленні выгад сацыяльнай палітыкі — аснова ў рабоце сенатара, — падкрэсліла яна.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

КАБ ВЕДАЛІ ДЗЕЦІ

Як у Батчынскім сельсавеце клапоцяцца аб захаванні гістарычнай памяці

